ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Студатрад у белых халатах

Першакурснік — як многа ў гэтым слове!

Хто ён, Адам Мальдзіс?

СТАР. 6-7

ЛІЧБА ДНЯ

4 млн 473,3 тысячы чалавек

было занята ў эканоміцы краіны сёлета ў ліпені. Гэта на 1,5% менш, чым у ліпені мінулага года, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Арганізацыямі (без суб'ектаў малога прадпрымальніцтва) у ліпені гэтага года прынята на працу 73,2 тыс. чалавек (2,3% сярэднямесячнай колькасці), у тым ліку на дадаткова ўведзеныя працоўныя месцы — 3,3 тысячы. Звольнена па розных прычынах 70,7 тыс. чалавек. З іх 4,7% — за прагул і іншыя парушэнні працоўнай дысцыпліны, 0,9% — у сувязі са скарачэннем колькасці або штату работнікаў, ліквідацыяй арганізацый. Па звестках Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, колькасць зарэгістраваных беспрацоўных на канец ліпеня склала 46,6 тыс. чалавек. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя на канец ліпеня гэтага года склаў 1% ад эканамічна актыўнага насельніцтва.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.08.2015 г.

Долар ЗША	17700,00	▼
Еўра	20356,00	▼
Рас. руб.	255,13	▲
Укр. грыўня	834,91	▲

ISSN 1990 - 763X
15163
9 771990 763008

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЖНІЎНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 163 (28021) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ШКОЛЬНЫ ЗВАНОК НА ДВАІХ

Віцебскія блізняты Кіра і Ірына КАВАЛЕНКІ сёлета стануць першакласніцамі гарадской 45-й школы. Дзяўчынкі сядуць за парту падрыхтаванымі: яны ўжо ўмеюць чытаць, пісаць і лічыць.

Фота БЕЛТА.

■ Рынак працы

ВУЧЫЦЦА НІКОЛІ НЕ ПОЗНА?

Часцяком «пазлы» вакансій не супадаюць з магчымасцямі і патрабаваннямі прэтэндэнтаў на працоўнае месца

Мая юная суседка атрымлівае юрыдычную адукацыю завочна, але ўжо сёння лічыць, што можа працаваць па спецыяльнасці. Вось толькі ніхто не прагне браць яе на работу. Гавораць, што юрысты не патрэбны. Дарэчы, як і эканамісты, бухгалтары, ахоўнікі, інжынеры, сацыяльныя супрацоўнікі, памочнікі выхавальнікаў. Больш за тое, сёння залішнія на рынку працы і грузчыкі, кладаўшчыкі, дворнікі, вартаўнікі, прыбіральшчыкі...

Тым часам на пачатак жніўня ў гомельскім гарадскім банку даных ёсць інфармацыя пра 767 вакансій. Патрабуюцца, у асноўным, рабочыя высокай кваліфікацыі. Або спецыялісты ў галіне медыцыны. Накшталт: акушэрка, медыцынскі судовы эксперт, урач, медыцынская сястра... А тыя 2711 грамадзян, якія зараз стаяць на ўліку ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама, не адпавядаюць запытам найманальнікаў.

Практычна ва ўсіх выпадках такой неадпаведнасці ім прапануюць набыць новую спецыяльнасць. **Начальнік аддзела прафарыентацыі, прафадукацыі і інфармацыйнай работы ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама Таццяна КРУПЯНКА** адзначае, што пералік прафесій, якія прапануюць згодным перавучвацца, абумоўлены запатрабаваннямі на рынку працы:

— Але ж мы гатовы накіраваць на навучанне беспрацоўнага, які знайшоў працу па прафесіі вельмі спецыфічнай, яму неабходна навучанне і яго згодны чакаць наймальнік. У такім выпадку па гарантыйным пісьме ад прадпрыемства мы накіроўваем на навучанне беспрацоўных. Таксама працуем з прадпрыемствамі і прапануем ім пакрыццё затрат на навучанне супрацоўнікаў. Мы штогод закладаем грошы і на кампенсацыю. Калі плануецца скарачэнне па адной прафесіі, але патрэбны спецыялісты па іншай, калі прадпрыемства гатова сваіх супрацоўнікаў перавучваць, па іх заяўцы можам кампенсаваць кошт выдаткаў на навучанне гэтых супрацоўнікаў.

СТАР. 3

■ На слыху

ЦЭНЫ НА АЙЧЫННЫЯ ЛЕКІ — ПАД КАНТРОЛЕМ

70 працэнтаў беларускіх лекаў, што рэалізуюцца на ўнутраным рынку, знаходзяцца ў цэнавым дыяпазоне да 1 долара ў эквіваленце. А 35 найменняў лекаў выпускаюцца з адмоўнай рэнтабельнасцю, прычым па некаторых пазіцыях планавая стратнасць дасягае 40%. Тым не менш па выніках першага паўгоддзя доля айчынных лекаў вырасла на ўнутраным рынку ў фінансавым эквіваленце да 48,5 працэнта. Аб гэтым паведаміў журналістам намеснік дырэктара Дэпартамента фармацэўтычнай прамысловасці Міністэрства аховы здароўя Віктар ШЭІН.

— Да канца года перад намі пастаўлена задача давесці долю беларускіх лекаў да 50%. Мяркую, што мы з ёй справімся і задаволім патрэбы насельніцтва ў якасных і даступных лекавых сродках, — дадаў Уладзімір Шэін. — Беларуская фармацэўтычная прамысловасць стала канкурэнтаздольным гульцом як на ўнутраным, так і на знешніх рынках. Нашы лекі экспартуюцца ў 29 краін свету.

Сёння беларускія фармацэўтычныя вытворцы выпускаюць ужо больш як 4930 найменняў лекавых сродкаў. Кожны год рэгіструецца не менш за 100 новых прэпаратаў, вытворчасць якіх засвоілі нашы заводы. На засваенне выпуску джэнерыка (аналага арыгінальнага лекавага сродку) у сярэднім патрабуецца 2-3 гады.

СТАР. 3

■ Выбары-2015

У РЭЧЫШЧЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Назіральнікі ад БДІПЧ АБСЕ прыбываюць у краіну

У Беларусі ўжо знаходзяцца 11 назіральнікаў місіі БДІПЧ АБСЕ. Гэта стала вядома па выніках сустрэчы Лідзіі Ярмошынай, старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні дзяржаўных рэферэндумаў, і кіраўніка місіі БДІПЧ АБСЕ па назіранні за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Жака Фора. Раней Жак Фор займаў такія пасады, як пасол Францыі ва Украіне, сустаршыня Мінскай групы АБСЕ (па ўрэгуляванні нагорна-карабахскага канфлікту).

«Нягледзячы на тое, што ў краіну прыбылі пакуль толькі 11 назіральнікаў, Цэнтрвыбаркам выдаў пасведчанні на ўсе 48 чалавек. Астатнія прыбудуць у краіну толькі на наступным тыдні», — паведаміла старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі. Яна дадала, што Жак Фор праінфармаваў яе аб тым, хто будзе працаваць у складзе місіі і як яны плануюць пастроіць сваю работу.

Кіраўнік місіі папрасіў ЦВК аказваць садзейнічанне ў прадастаўленні дакументаў, наладжванні кантактаў. Лідзія Ярмошына гарантавала Жаку Фору, што такая дапамога будзе прапанавана. Яна праінфармавала кіраўніка назіральнікаў БДІПЧ АБСЕ аб першым этапе выбарчай кампаніі, які ўжо завяршыўся. Гаворка ішла і пра тое, як ідзе праца са зваротамі і скаргамі грамадзян.

Лідзія Ярмошына і Жак Фор пагаварылі таксама і аб прэтэндэнтах на пасаду Прэзідэнта. «Гэта былі яшчэ пакуль аргпытанні. Яны не мелі дачынення да нейкіх момантаў або асаблівасцяў правядзення перадвыбарнай кампаніі», — удакладніла Лідзія Ярмошына.

Учора з Жакам Форам таксама сустрэўся міністр замежных спраў нашай краіны Уладзімір Макей. Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства выказаў спадзяванне на аб'ектыўны падыход міжнародных назіральнікаў да ацэнкі выбарчай кампаніі. Падчас сустрэчы абмяркоўваўся шэраг пытанняў, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем маючых адбыцца выбараў, арганізацыяй міжнароднага назірання і ўдзелам у ім місіі БДІПЧ. Як паведаміла прэс-служба МЗС, «беларускім бокам пацверджана гатоўнасць распачаць усе неабходныя захады для правядзення выбараў у поўнай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і міжнароднымі абавязацельствамі».

* * *

Пазней, падчас прэс-канферэнцыі для беларускіх журналістаў, кіраўнік місіі БДІПЧ АБСЕ паведаміў, што назіральнікі з 16 краін АБСЕ прыбудуць у Мінск 31 жніўня.

«Напярэдадні дня выбараў мы будзем чакаць прыбыцця ў краіну больш буйной групы назіральнікаў, кароткатэрміновых, колькасць якіх складзе каля 400 чалавек», — праінфармаваў Жак Фор.

Паводле яго слоў, дзейнасць місіі будзе таксама ўключаць супрацоўніцтва з назіральнікамі Парламенцкай асамблеі АБСЕ і Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы. Падчас работы будзе апублікавана адна прамежкавая справаздача, а назаўтра пасля выбараў будзе абнародавана заключэнне адносна гэтай электаральнай падзеі.

Жак Фор таксама акцэнтаваў увагу на тым, што праца назіральнай місіі БДІПЧ АБСЕ падчас прэзідэнцкай кампаніі ў нашай краіне ніякім чынам не прадугледжвае ўмяшання ў выбарчы працэс.

«Наша роля заключаецца ў тым, каб ажыццяўляць назіранне», — заявіў Жак Фор. Ён запэўніў, што праца назіральнікаў місіі будзе строіцца на аснове прафесіяналізму, непрадузятасці, празрыстасці і аб'ектыўнасці. Таксама ён паведаміў, што місія плануе правесці сустрэчы з прадстаўнікамі дзяржорганаў на розных узроўнях, грамадзянскай супольнасцю і СМІ.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

ЛЕПШ ГРАМАДСКАСЦЬ І ПСІХОЛАГІ, ЧЫМ СПЕЦУСТАНОВА

Гаварыць аб адкрыцці спецыялізаванай установы для падлеткаў з залежнасцю ў Беларусі пакуль заўчасна. Такое меркаванне выказала ўчора намеснік прэм'ер-міністра Наталля Качанава ў час пасяджэння камісіі па справах непаўналетніх пры Савеце Міністраў Беларусі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.

Мерапрыемства прайшло ў Крывічах на базе спецыяльнага лячэбна-выхаваўчага прафесійна-тэхнічнага вучылішча закрытага тыпу. «Камісія прыйшла да высновы, што да перавыхавання цяжкіх падлеткаў трэба прыцягваць грамадскасць, павялічваць штат псіхолагаў, адкрываць больш рэабілітацыйных цэнтраў, а таксама сур'ёзней каараць за ўцёкі са спецустаноў», — адзначылі па выніках пасяджэння ў прэс-службе.

У час пасяджэння міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў звярнуў увагу на тое, што ва ўсіх установах такога тыпу ў адным і тым жа асяроддзі ўтрымліваюцца тыя, каму неабходна лячэнне ад алкагольнай і нікацінавай залежнасці, і тыя, хто трапіў туды як злосны парушальнік грамадскага парадку. «На актуальнасць гэтага пытання звярнула ўвагу і Наталля Качанава, згадзіўшыся, што гэта няправільна. Аднак, паводле яе слоў, весці размову аб адкрыцці спецыялізаванай установы для залежных падлеткаў пакуль заўчасна», — адзначылі ў прэс-службе ўрада.

Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі таксама шэраг іншых актуальных пытанняў.

НА СУВЯЗІ — УЛАДА

Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца ў гэтую суботу, 29 жніўня

З пачатку года кожную суботу на працягу трох гадзін прадстаўнікі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, а таксама раённыя ўлады адказваюць на самыя хвалюючыя пытанні жыхароў Беларусі. Эканамічнае развіццё гарадоў, своечасовая выплата заработнай платы, праблемы ў сферы ЖКГ і многія іншыя пытанні ў гэты час становяцца ключавымі. Прамыя тэлефонныя лініі праходзяць з 9 да 12 гадзін. Як правіла, у кожным з рэгіёнаў адказваюць не менш як на чатыры дзясяткі званкоў.

У гэтую суботу на сувязі:

Брэсцкі аблвыканкам

намеснік старшыні ЦУПРЫК Леанід Аляксандравіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам

намеснік старшыні БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч (80212204260);

Гомельскі аблвыканкам

намеснік старшыні ПІРШТУК Баляслаў Казіміравіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам

намеснік старшыні ДЗЯШКО Уладзімір Іосіфавіч (80152735644);

Мінскі аблвыканкам

кіраўнік спраў МАРКЕВІЧ Іван Станіслававіч (80175004160);

Магілёўскі аблвыканкам

кіраўнік спраў ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч (80222501869);

Мінскі гарвыканкам

старшыня гарадскога Савета дэпутатаў ПАНАСЮК Васіль Васільевіч (80172224444).

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «На100ящий отдых»

С 10.07.2015 г. по 06.08.2015 г. каждый гражданин Республики Беларусь мог стать участником рекламной игры «На100ящий ОТДЫХ!» от ювелирных сетей «Золотая Мечта», «Царское Золото» и «Zoloto.by» и выиграть одну из 100 путевок в Турцию!

Для того, чтобы принять участие в розыгрыше 100 путевок, необходимо было приобрести в период с 10.07.2015 г. по 06.08.2015 г. одно или несколько ювелирных изделий из золота 585 пробы, серебра 925 пробы, часы стоимостью за 1 изделие от 500 000 (пятьсот тысяч) белорусских рублей в одном либо нескольких ювелирных магазинах «Царское золото», «Золотая мечта», «Zoloto.by». Участником необходимо было заполнить анкету и сохранить товарный и кассовый чеки на товар до окончания рекламной игры. Главный приз розыгрыша – 100 путевок в Турцию!

Розыгрыш путевок проходил в 4 этапа. Первый розыгрыш состоялся 18.07.2015 г в г. Бресте по адресу ул. Советская, д. 72, в ювелирном магазине «Царское Золото». Участниками 1 этапа стали покупатели, заполнившие анкету с 10.07 по 16.07. По результатам розыгрыша были отобраны 25 победителей, чьи анкеты были случайным образом последовательно вытянуты из лототрона.

Таблица 1

Победители 1 этапа рекламной игры «На100ящий отдых»

№ п/п победителя	№ анкеты	Город проживания победителя	ФИО
1	00037	Жлобин	Погодина Юлия Геннадьевна
2	3017	Добруги	Степанцов Никита Олегович
3	2545	Брест	Микитюк Анастасия Эдуардовна
4	27673	Брест	Козелов Василий Викторович
5	19729	Речица	Никулина Марина Владимировна
6	1666	Копыль	Хилько Виталий Сергеевич
7	23263	Гомель	Швец Елена Сергеевна
8	18913	Солигорск	Касьян Екатерина Владимировна
9	3014	Гомель	Самойленко Ольга Витальевна
10	27657	Каменец	Павлючук А.Н.
11	8056	Минск	Пранович Вероника Игоревна
12	1057	Дрибин	Карпенкова Ирина Владимировна
13	27317	Жлобин	Галич Константин Анатольевич
14	3343	Лида	Коробач Елена Вячеславовна
15	5269	Барановичи	Сасим Оксана Николаевна
16	20887	Минск	Ефимов Дмитрий Владимирович
17	02138	Минск	Юницкая Мария Иосифовна
18	28706	Минск	Стрельский Сергей Михайлович
19	27422	Жлобин	Лантева Лариса Григорьевна
20	20033	Боровляны	Пулькач Андрей Владимирович
21	18656	Минск	Лесук Мария Романовна
22	05870	Минск	Горошко Андрей Браниславович
23	07778	Барановичи	Здрок Павел Павлович
24	03117	Брест	Степаненко Алла Юрьевна
25	07642	Борисов	Грошев Александр Юрьевич

Во втором этапе участвовали анкеты покупателей, совершивших покупку с 17.07 по 23.07. Данный розыгрыш состоялся 25.07.2015 г. в г. Гомель, ул. Ленина, д. 63, м-н «Золотая мечта».

Таблица 2

Победители 2 этапа рекламной игры «На100ящий отдых»

№ п/п победителя	№ анкеты	Город проживания победителя	ФИО
26	05814	Шклов	Асецкая Анна Сергеевна
27	17817	Новополоцк	Медвецкий Владимир Петрович
28	02162	Минск	Лабко Сергей Сергеевич
29	02800	Минск	Потапович Марта Станиславовна
30	08052	Минск	Бесман Наталья Анатольевна
31	26493	Минск	Лёлич Светлана Николаевна
32	18947	Солигорск	Шпилевская Юлия Владимировна
33	27720	Брест	Кустра Ольга Петровна
34	02165	Минск	Грицик Тарас Васильевич
35	05834	Могилев	Пагирская Наталья Сергеевна
36	05546	Минск	Позднякова Яна Вячеславовна
37	08410	Речица	Жадан Светлана Викторовна
38	00071	Жлобин	Жичко Ольга Викторовна
39	05316	Барановичи	Трофимчук Дмитрий Николаевич
40	27797	Бобруйск	Голочева Ольга Викторовна
41	18842	д. Новобеличи	Серебрякова Мария Борисовна
42	26680	Мозырь	Лепухова Алина Андреевна
43	20055	Борисов	Бойко Светлана Владимировна
44	06838	Новополоцк	Мишина Ольга Владимировна
45	06169	Гомель	Федорова Анна Вадимовна
46	12832	Минск	Болотник Екатерина Андреевна
47	04553	Барановичи	Кузьменко Анастасия Николаевна
48	24168	Жлобин	Шиханцова Марина Васильевна
49	01748	Минск	Туцкая Ирина Андреевна
50	02510	Островец	Недалтовская Аида Ивановна

Третий этап розыгрыша проходил 01.08.2015г. в центре столицы по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 3, м-н «Царское Золото». Участниками розыгрыша стали покупатели, заполнившие анкету с 24.07 по 30.07.

Таблица 3

Победители 3 этапа рекламной игры «На100ящий отдых»

№ п/п победителя	№ анкеты	Город проживания победителя	ФИО
52	23456	Лида	Груская Виктория Александровна
53	26908	Нарочь	Боковец Ярослав Викторович
54	03316	Кобрин	Чирун Елена Васильевна
55	16123	Вилейка	Святохо Ольга Олеговна
56	07696	Минск	Юркевич Ольга Михайловна
57	15675	минск	Донилин Сергей Викторович
58	29944	Могилев	Манькова Александра Павловна
59	20405	Минск	Левая Людмила Ивановна
60	03207	Минск	Рябцева Елена Игоревна
61	21181	Могилев	Будницкая Е. И.
62	21998	Гомель	Горбачева Марина Григорьевна
63	19923	Орша	Пучкова Виктория Алексеевна
64	07527	Скидель	Смех Алла Владимировна
65	08431	Лоев	Филон Наталья Михайловна
66	10356	Могилев	Богомолова Евгения Ивановна
67	07134	Жодино	Скроцкий Александр Владимирович
68	04835	Борисов	Вусик Зинаида Аркадьевна
69	12600	Сморгонь	Янч Мария Иосифовна
70	17077	Минск	Зайцев В.В.
71	22563	Минск	Скоморох Виктория Леонидовна
72	04778	Пинск	Волк Дмитрий Вадимович
73	02406	аг. Гатово	Девкш Светлана Николаевна
74	30071	Слуцк	Крепская Ирина Александровна
75	13507	аг Пенчин	Цуранкова Ольга Евгеньевна

Четвертый, завершающий, розыгрыш состоялся 08.08.2015 г. в ТЦ «Корона Замок» в ювелирном магазине «Золотая мечта» по адресу г. Минск, пр-т Победителей, д. 65. В данном розыгрыше участвовали анкеты покупателей, совершивших покупку с 31.07 по 06.08 августа.

Таблица 4

Победители 4 этапа рекламной игры «На100ящий отдых»

№ п/п победителя	№ анкеты	Город проживания победителя	ФИО
76	7615388	Сморгонь	Гойло Людмила Алексеевна
77	25959	Брест	Сипач Анастасия Николаевна
78	08851	Сенно	Землемеров Руслан Алексеевич
79	20375	Речица	Брель Мария Валерьевна
80	11912	Гродно	Коваль Андрей Игоревич
81	09871	Калинковичи	Кошелькова Алла Васильевна
82	09630	д. Малеч	Докучиц Ольга Юзефович
83	09059	Щучин	Макуш Виктория Станиславовна
84	07852	Минск	Дюрова Алеся Владимировна
85	11204	Минск	Леонова Екатерина Алексеевна
86	16090	д. Трабы	Видерацкая Светлана Николаевна
87	09062	Гродно	Кудров Петр Владимирович
88	22637	Минск	Ильин Владимир Александрович
89	17372	Минск	Василевская Елизавета Сергеевна
90	11039	д. Черногубово	Гейдельбах Наталья
91	19595	Новополоцк	Шутиков Андрей Петрович
92	28087	Мозырь	Кошевенко Елена Николаевна
93	11304	Лида	Щетко Игорь Анатольевич
94	10573	Минск	Герасимова Наталья Викторовна
95	12094		Асецкая Рита Леонидовна
96	18328	Солигорск	Ерамкович Елена Анатольевна
97	12181	Минск	Казицкий Дмитрий Николаевич
98	21291	Минск	Белоглазова Алевтина Николаевна
99	10916	Жодино	Боришук Наталья Алексеевна
100	23850	Мозырь	Синькевич Марина Сергеевна

Для всех пришедших на розыгрыш участников была подготовлена развлекательная шоу-программа с участием артистов-мимов, аниматоров с цветами, ведущего, а также фуршетный стол со сладкими угощениями!

Поздравляем победителей! Всем, кому не удалось победить или поучаствовать в розыгрыше этим летом, – советуем не расстраиваться! Ювелирные сети «Золотая мечта», «Царское Золото» и «Zoloto. by» регулярно проводят масштабные акции по всей стране, победителем может стать каждый!

Сведения об организаторе:

1. Частное торговое унитарное предприятие «Бигпрайм».

2. Юридический адрес: г. Молодечно, ул. Притыцкого, д. 12, комн. 26. Почтовый адрес: 220004, г. Минск, ул. М. Танка, д. 4.

3. Наименование рекламной игры – «На100ящий отдых».

4. Срок начала и окончания рекламной игры: начало – 10 июля 2015 г., окончание – 14 сентября 2015 г.

5. Территория, место и срок проведения рекламной игры. Территория проведения рекламной игры – ювелирные магазины «Царское золото», «Золотая мечта» и «Zoloto.by» на территории Республики Беларусь.

6. Свидетельство №2588 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 26 июня 2015 г., выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

7. Количество участников рекламной игры – 21914 человек.

8. Призовой фонд был разыгран полностью. Его размер составляет 1 050 000 000 (Один миллиард пятьдесят миллионов рублей) рублей. Стоимость Сертификата на тур в Турцию (включающий: авиаперелет Минск – Анталия – Минск; проживание 7 ночей; питание по системе «все включено»; трансфер аэропорт – отель – аэропорт; медицинская страховка) составляет 10 500 000.

9. Победители указаны в таблице №1, таблице № 2, таблице № 3, таблице № 4, общим количеством 100 человек.

10. Телефон для справок: +375(17)203-00-85.

Сайт: http://carskoe.by/ , http://gold-dream.by/

11. ЧТУП «Бигпрайм». УНП691511104, зарегистрированное Молодечненским районным исполнительным комитетом 26 июня 2013 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей. Специальное решение (лицензия) выдано на основании решения от 9 августа 2013 г. №267 сроком на десять лет и зарегистрировано в реестре специальных разрешений (лицензий) Министерства финансов Республики Беларусь № 21-01135. Действительна по 8 августа 2023 г.

■ Бяспека

ПРЫШПІЛІЦЦА І ЗАСТАЦЦА Ў ЖЫВЫХ

Дарожна-транспартныя здарэнні, падзенні, атручванні, утапленні, апёкі і самазабойствы — найбольш актуальныя прычыны гібелі і траўматызму нашых дзяцей. На сустрэчы з журналістамі **Леанід ЛОМАЦЬ, намеснік дырэктара Цэнтра траўматалогіі і артапедыі,** не ўтойваў сваёй занепакоенасці:

— Звычайна ДТЗ з'яўляюцца асноўнай прычынай гібелі дзяцей, але сёлета за паўгоддзе на першы план выйшлі трагедыі на вадзе, — адзначыў урач. *— Ужо не стала 14 дзяцей, а спякотны жнівень, баюся, прынясе яшчэ больш несуцяшальныя лічбы, бо мы пакуль што маем статыстыку толькі за першае паўгоддзе.*

Для прафілактыкі і папярэджвання дзіцячага траўматызму ў Нясвіжы плануецца стварыць Рэсурсны цэнтр, дзе можна будзе авалодаць тэхнікай паводзін у надзвычайных сітуацыях. Дзеці атрымаюць магчымасць патрэніравацца рабіць масаж сэрца і штучнае дыханне на чатырох спецыяльных манекенах.

— Актуальны напрамак у прафілактыцы бытавога траўматызму — стварэнне школ і факультатываў для бацькоў, бо часам дарослыя проста не бачаць і не ўяўляюць небяспечных момантаў для дзіцяці ў пэўных сітуацыях, — кажа **Алена ГАЛАЎНЁВА, намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай працы Міністэрства адукацыі.**

Дарэчы, выпадкаў траўматызму і атручванняў у нас становіцца менш, затое актуальная праблема, калі дзеці застаюцца без нагляду. І бацькі павінны несці адказнасць за тое, што пакідаюць малых адных. Як і за тое, што не прышпільваюць іх у транспарце, лічыць Леанід Ломаць.

Статыстыка па дзіцячым траўматызме: траўмы канечнасцяў — 60% (з іх 30% — пераломы), траўмы галавы і шыі (15%), тэрмічныя апёкі (3,5%), траўмы жывата, ніжняй часткі спіны і пазваночніка і таза (2-3%).

Днямі загінуў 6-гадовы хлопчык, які не быў прышпілены на заднім сядзенні. Машыну занесла на дарозе, яна перакулілася некалькі разоў і прыдушыла сабой дзіця, якое вылецела праз шкло. Бацькі, якія ехалі сперади прышпіленыя, засталіся ў жывых.

Ірына СІДАРОК

■ Акцыя

Дапаможам дзецям разам!

Стартаваў збор сродкаў для дабудоўвання дзіцячага хоспіса

Чэмпіёнка Еўропы па лёгкай атлетыцы Аліна ТАЛАЙ і кампанія Velcom арганізавалі сацыяльны праект #velcombegom, мэтай якога з'яўляецца збор сродкаў на будаўніцтва новага дзіцячага хоспіса ў Бараўлянах. Аб'ект пачаў ствараццa ў снежні мінулага года, на сёння там засталося зрабіць дах і правесці ўнутраныя работы. Менавіта на гэта і пойдуць сабраныя грошы. Прыняць удзел у дабрачыннай акцыі заклікала вядомая беларуская спартсменка Аліна Талай:

— Я заклікаю ўсіх неабыякавых людзей зрабіць добрую справу. Веру, што нам удасца сабраць патрэбную суму, бо беларусы — чулыя і спагадлівыя людзі. Я не магу быць абыякавай да падобных рэчаў, таму што з самага дзяцінства мяне вучылі, што ўсе мы — вялікая сям'я, неабходна дапамагаць адно аднаму, як бы не было складана самому.

Прыняць удзел у акцыі можа кожны жыхар нашай краіны, абаненту Velcom для гэтага дастаткова даслаць «SMS-дапамогі» з хэштэгам #velcombegom або патэлефанаваць на кароткі нумар 2015, тым самым пералічыўшы 10 тыс. рублёў. Дапамагчы змогуць не толькі дарослыя: 6 верасня адбудзецца дабрачынны дзіцячы забег у мінскім парку Перамогі. У ім змогуць прыняць удзел дзеці ад 4 да 12 гадоў, за кожнага маленькага «спартсмена» кампанія velcom пералічыць 150 тыс. рублёў на дабудаванне новага дзіцячага хоспіса.

Напярэдадні дзіцячага забегу ў парку Перамогі пачнуць працаваць дзіцячыя мабільныя пляцоўкі, дзе вопытныя трэнеры і вядомыя спартсмены будуць праводзіць зарадку, спецыяльна распрацаваную чэмпіёнкай Еўропы па лёгкай атлетыцы Алінай Талай.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ, *lobazhevich@zviazda.by*

ВУЧЫЦЦА НІКОЛІ НЕ ПОЗНА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прадпрыемства можа перавучваць супрацоўнікаў за свае грошы, а потым прасіць ва ўпраўлення па працы кампенсацыю выдаткаў за навучанне. Гэтая магчымасць прапісана ў законе пра занятасць. На жаль, прадпрыемствы ёй не жадаюць карыстацца. Магчыма, баяцца падаваць неабходныя дакументы на кампенсацыю. Думаюць, што гэта складана. Насамрэч, нічога складанага няма. Сапраўды, ёсць пералік дакументаў, які патрэбна вытрымаць. Але ж мы такія дакументы фарміруем кожны раз, калі накіроўваем групу на навучанне. Таму не бачу складанасцей. Проста трэба вызначыць чалавека, які гэтым будзе займацца, а мы са свайго боку гатовы пракансультаваць любога, хто да нас звернецца.

Таццяна Крупянка падкрэслівае, што важна, каб прадпрыемства вучыла супрацоўнікаў у дзяржаўных установах адукацыі, якія маюць для гэтага спецыяльныя ўмовы. У любой галіне прамысловасці ёсць такія акрэдытаваныя цэнтры навучання.

Між тым сярод працадаўцаў распаўсюджана думка, што людзі, якія шукаюць працу праз цэнтр занятасці, ні да чаго не прыдатны. Гэта адна з прычын, чаму кадравікі часам імкнуцца схаваць інфармацыю аб вакансіях, не дзеляцца ёй з цэнтрамі.

— Так, сапраўды, часам кажуць: у вас сумніўны кантынгент, — дзеліцца сваімі меркаваннямі Таццяна Крупянка. — Яны сумніўнымі здаюцца толькі таму, што страцілі працу, паспрабавалі яе самастойна знайсці і — не атрымалася. Але ж любы чалавек можа апынуцца на гэтым месцы. Людзі — паўсюль людзі, яны шукаюць працу, і многія з іх гатовы зрабіць усё, каб працаваць добра. Быў у нас, напрыклад, малады чалавек, які па прымусе бацькоў вывучыўся на праграміста. Але ж пасля зразумеў, што насамрэч хоча стаць кухарам, і стаў ім.

Між тым у тых, хто шукае працу, сапраўды хапае псіхалагічных праблем. Ад таго, як сябе чалавек прэзентуе, многае залежыць. Дарэчы, ёсць шмат парад для шукальнікаў працы наконт таго, як сябе паводзіць, у што апрануцца, што казаць... Меркаванне пра свае магчымасці абавязкова павінна падмацоўвацца дыпломам аб прысваенні кваліфікацыі і працоўнай кніжкай.

Начальнік аддзела прафарыентацыі распавядае:

— Нехта яшчэ падчас вучобы на курсах працаўладкоўваецца, а нехта ходзіць і ные, што «курсы дрэнныя», хаця вакансіі па выбранай спецыяльнасці ёсць. Мы ж не можам наймальніка прымусіць узяць прэтэндэнта на працоўнае месца. Але ж большая частка людзей адаптуюцца ў перыяд навучання. Калі спачатку яны сапраўды няўпэўненыя ў сабе, часта нервуюцца і гатовы канфліктаваць, то пасля заканчэння навучання мы бачым упэўненых людзей, якія набылі прафесію і магчымасць зарабляць.

— Колькі? — пытаюцца маладыя людзі, для якіх грошы — адзіны крытэрый будучага месца іх працы. Яны не пытаюцца, чым давядзецца займацца, наколькі гэта супадае з іх здольнасцямі і інтарэсамі... Яны хочуць усё і цяпер. З цэнтра занятасці такія найчасцей за ўсё выходзяць расчараванымі. Да таго ж падлеткі, якія летам жадаюць знайсці падпрацоўку, ці ўчарашнія не паступіўшыя ў ВНУ школьнікі здзіўляюцца, калі ім прапаноўваюць некваліфікаваную працу прыбіральшчыцы ці дворніка.

Часцяком менавіта не падмацаваныя адукацыяй амбіцыі перашкаджаюць маладым людзям знайсці нармальную працу. У наймальніка, зразумела, свае мэты — ім патрэбны гатовы спецыяліст, яшчэ і з вопытам. Супрацоўнікі цэнтра занятасці ўсё ж раяць спусціцца з нябёсаў на зямлю,

Сярод працадаўцаў распаўсюджана думка, што людзі, якія шукаюць працу праз цэнтр занятасці, ні да чаго не прыдатны. Гэта адна з прычын, чаму кадравікі часам імкнуцца схаваць інфармацыю аб вакансіях, не дзеляцца ёй з цэнтрамі.

пачаць з невялікага заробку, напрацаваць вопыт, каб гадоў праз пяць-дзесяць заняць дастойную пасаду з адпаведным заробкам. Сумна і доўга? Але ж бліжэй да рэчаіснасці.

— Чалавек павінен асэнсоўваць свае рэальныя магчымасці, — нагадвае Таццяна Аляксандраўна. — Тады не будзе завышаных патрабаванняў да наймальніка і бясконцых пошукаў работы. «Вялікія грошы — сёння» — гэта тыповая памылка маладых людзей, якія шукаюць першае месца працы. Калі чалавек шукае працу толькі па гэтым крытэрыі, ён сам сябе заганяе ў пастку, з якой цяжка будзе выбрацца. Тыповы выпадак: малады чалавек ідзе на першае месца працы ахоўнікам у краму, дзе добры заробак. Яго сябар — спецыялістам на невялікую зарплату, але з перспектывамі росту. Праз дзесяць гадоў той, хто спачатку згадзіўся на невялікі заробак і старанна напрацоўваў аўтарытэт, вырасце і будзе мець значна вышэйшую зарплату, а той, хто пайшоў ахоўнікам, на той жа пасадзе і застанецца. Пра гэта многія маладыя людзі не задумваюцца, а трэба было б.

Мая юная суседка, якая атрымлівае адукацыю юрыста, між тым уладкавалася. У краму прадаўшчыцай. Заробак быццам больш-менш прымальны, але дзяўчына зноў незадаволена — цяпер распарадкам працы і зносінамі ў калектыве. Ну што ты зробіш: вопыт, у тым ліку жыццёвы, замацоўваецца толькі асабістымі гузамі. Калі замацоўваецца...

Ірына АСТАШКЕВІЧ, *astashkevich@zviazda.by*

ЦЭНЫ НА АЙЧЫННЫЯ ЛЕКІ — ПАД КАНТРОЛЕМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адказваючы на пытанне журналіста «Звязды», чаму здараецца так, што беларускія лекі прайграюць па цане імпартным джэнерыкам, Віктар Шэін паведаміў наступнае:

— Зараз дзейнічае мараторый: мы ўзялі на сябе абавязацельствы не паднімаць цэны на айчынныя лекі, паколькі разумеем, што ў цяперашняй сітуацыі не ўсе могуць дазволіць сабе дарагія імпартныя прэпараты. А калі цана ўсё ж такі паднімаецца, то гэта павышэнне закранае толькі долю імпартнага складніка ў леках, а дакладней, долю ў канчатковай цане фармацэўтычнай субстанцыі, што закупляецца за мяжой. Прычым вытворца павінен нам прадаставіць эканамічнае абгрунтаванне, перш чым атрымае дазвол на павышэнне цаны.

Што тычыцца больш танных імпартных джэнерыкаў, то, па словах прадстаўніка Міністэрства аховы здароўя, любы імпартны вытворца, які жадае замацавацца на рынку, мае права дэмпінгаваць. Указ кіраўніка дзяржавы №366, які вызначае парадак цэнаўтварэння, дазваляе вытворцу імпартнага лекавага сродку пры ўваходзе на рынак Беларусі задэкляраваць свой кошт.

Для таго, каб не дапусціць манапалізму айчынных вытворцаў на ўнутраным рынку, адзін і той жа лекавы сродак у той жа дазіроўцы дазволена выпускаць двум-тром беларускім прадпрыемствам. Прымаючы ўдзел у конкурсных закупках, адно айчыннае фармпрадпрыемства становіцца пераможцам, а другое, маючы рэгістрацыю свайго прэпарата за межамі Беларусі, ажыццяўляе яго пастаўкі на экспарт. Такім шляхам прымаюцца кіраўніцкія рашэнні па дыверсіфікацыі збыту лекавых сродкаў.

А для таго, каб аптэчнай сетцы было больш выгадна рэалізоўваць беларускія лекавыя сродкі, летась аптэкам было дадзена права прадастаўляць на іх сніжкі.

— Магчыма, мы недзе недапрацоўваем у плане інфармавання насельніцтва па асартыменце беларускіх лекаў, якасці і эфектыўнасці нашых прэпаратаў, таму будзем гэту сітуацыю выпраўляць, — паабяцаў Віктар Шэін.

Надзея НІКАЛАЕВА, *nikalaeva@zviazda.by*

АД ТРАКТАРА МАГЛА ЗАНЯЦЦА ВЁСКА

У Валожынскім раёне выратавальнікі адстаялі ад агню вёску Узбалаць.

У сярэдзіне дня паступіла паведамленне, што непадалёку ад вёскі гарыць трактар. Ад яго і прычапнога прыстасавання — рулоннага прэс-падборшчыка — занялося і дзесяць гектараў іржышча, потым полымя перакінулася на прыватны хлеў. Існавала пагроза распаўсюджвання пажару на іншыя будынкі. Быў аб'яўлены збор асабовага складу Валожынскага раённага падраздзялення МНС. Дакладныя дзеянні выратавальнікаў дазволілі адстаяць вёску ад агню. У выніку ніхто не пацярпеў. Наступствы здарэння: знішчаны хлеў, у трактара пашкоджана кабіна і згарэлі колы, пашкоджана прычапное прыстасаванне.

Расказвае жыхарка вёскі і падпісчыца «Звязды» Наталля СКАДОРАВА:

— Сапраўды, пажар быў вельмі вялікі. Некалькі гадзін гарэла. Я, праўда, на гадзіннік не глядзела, у самой хата адтуль зусім блізка — бегала з рыдлёўкай, дапамагала абкопваць зямлю, як і астатнія вяскоўцы. Самае страшнае, што ў такую спёку стаяў моцны вецер, таму полымя імгненна перакідвалася. Здаецца, толькі знікла ў адным месцы, як ужо гарыць у іншым. Тушыць уся вёска збеглася, з гаспадаркі прыгналі трактар з плугамі, каб абворваць. Але найбольш трэба падзякаваць пажарным — прыехалі вельмі хутка, пачалі змагацца, аблівалі вадой хаты. Дзякуй Богу, справіліся. Калі б не пажарныя, усё магло б скончыцца горш.

У ГЭТЫ Ж ДЗЕНЬ

У сталіцы згарэла 600 квадратных метраў травы. Самы вялікі пажар адбыўся каля 42-га кіламетра МКАД на тэрыторыі Ратамскага лясніцтва. У розных месцах лесапаркавай гаспадаркі гарэла трава на тэрыторыі ў 100 і 200 «квадратаў». Падчас тушэння пажару выратавальнікі знайшлі няправільна патушанае вогнішча, якое, верагодна, і стала прычынай выгарання сухой расліннасці.

Сяргей РАСОЛЬКА, *rs@zviazda.by*
Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ, *lyskavets@zviazda.by*

■ Разважанні пра сучаснасць

НЕ БУЛЬБАЙ АДЗІНАЙ

Пра гаспадарку «Брылёва», якую ўзначальвае славуты Аркадзь КОБРУСЕЎ, жартам гавораць, што яблыкі тут растуць паміж шматпавярховікаў, а кароў гадуюць на асфальце

Дарэчы, усё гэта недалёка ад ісціны. Сапраўды, жыллёвыя гмахі Чыгуначнага раёна Гомеля — праз пуці, а ўмовы, у якіх жывуць вяскоўцы аграгарадка Мічурынскае, — менавіта гарадскія. Пры гэтым надоі малака на карову амаль такія, як у Ізраілі (болей за 9 тысяч кілаграмаў), а ўраджайнасць гародніны дасягае еўрапейскага ўзроўню.

ДАСЯГНЕННІ Аркадзя Тарасавіча можна пералічваць і інакш. Званне заслужанага работніка сельскай гаспадаркі БССР і Зорку Героя Сацыялістычнай працы ён атрымаў яшчэ пры савецкай уладзе. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Чырвонага сцяга, ордэнам «Знак Пашаны», ён з'яўляецца ганаровым грамадзянінам Гомельскага раёна... Між тым ад гука медных труб галава не закружылася і сёння: у свае 78 гадоў у будучыню глядзіць упэўнена і разважае пра тое, куды далей гаспадарка будзе крочыць. Побач — каманда, якая стваралася не за год, і падтрымка самых блізкіх людзей, праверaных часам і пачуццямі.

Апошняе тычыцца ў тым ліку яго вернай спадарожніцы — жонкі. Калі Аркадзь Тарасавіч узгадвае пра яе, нават інтанацыя мяняецца. Паважліва так называе: «мая Марыя Аляксееўна». Дарэчы, у сямейным жыцці таксама адны дасягненні. Сын Саша — генерал міліцыі, па службовай лесвіцы вырас да намесніка міністра ўнутраных спраў Беларусі. Дачкой Ларысай таксама ганарыцца. Яна пайшла па матуліных слядах — цяпер узначальвае гастраэнтэралагічнае аддзяленне гомельскай бальніцы №3. Марыя Аляксееўна ўсё жыццё працавала аперацыйнай медсястрой і калісьці ў канцы 1950-х літаральна выхадзіла маладога Аркадзя, які на два з паловай года трапіў на бальнічную койку пасля аўтамабільнай аварыі. Праз 19 гадоў ёй яшчэ раз прыйшлося выцягваць мужа з таго света. Вось тады адчуў ён сапраўдную каштоўнасць крохкага жыцця і жаданне паспець зрабіць нешта карыснае для людзей.

ВЫПРАБАВАННІ Аркадзь Тарасавіч праходзіў разам з краінай. Самымі складанымі, гаворыць, былі тыя часы, калі адна дзяржава развалілася, а іншая толькі нараджалася. Між тым старшынёй гаспадаркі «Брылёва» ён стаў яшчэ пры СССР, у 1979 годзе. Тады саўгас «Брылёва» застаўся без кіраўніка, і Аркадзь Кобрусеў, які да гэтага працаваў начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі Гомельскага райвыканкама, узначаліў прадпрыемства са складанай спецыялізацыяй. Тады ў «Брылёва» з-за адсутнасці сховішча для гародніны з восені яе прадавалі па непрымальных коштах. Машынна-трактарны парк састарэў, ураджайнасць пакідала жадаць лепшага. Супрацоўнікі востра адчувалі дэфіцыт жылля... Што казаць, лёгка не было.

«Самае галоўнае, што ў тыя гады не былі разбураны калгасы і саўгасы. Тады многія прапанавалі іх распусціць, як гэта было зроблена ва Украіне. Калі б мы пайшлі па гэтаму шляху, поспеху не было б».

Калі ж Аркадзь Кобрусеў згадвае пра разбураную на пачатку 1990-х прамысловасць і беспрацоўе, у яго голасе горыч:

— Я пра ўсё гэта ведаю лепш, чым хто іншы. За 20 апошніх гадоў зроблена немагчымае. Калі адбыўся развал краіны, былі разбураны ўсе сувязі. І хоць мы, у адрозненне ад многіх, не дапускалі кардынальнага спаду, нават у горшыя часіны не залазілі ў крэдыты, штомесячна плацілі зарплату і аванс ва ўстаноўленыя тэрміны, цяжка прыходзілася і нам. Збіралі людзей і тлумачылі ім, што жыць трэба па тых сродках, што ёсць на гэты момант. Менавіта тады кіраўнік дзяржавы прыняў некалькі дырэктыў, якія дапамаглі вырашыць пытанні навядзення парадку і дысцыпліны. Самае галоўнае, што ў тыя гады не былі разбураны калгасы і саўгасы. Тады многія прапанавалі іх распусціць, як гэта было зроблена ва Украіне. Калі б мы пайшлі па гэтаму шляху, поспеху не было б. Трэба было ўмацоўваць дзяржаўныя гаспадаркі. Каб людзі працавалі, каб павялічвалася валавая вытворчасць прадукцыі, каб з'яўляліся сродкі для развіцця. Паступова аднаўляліся сувязі з расійскімі рэгіёнамі, адкрываліся новыя вытворчасці, з'яўлялася перспектыва ў людзей, якія карміліся ад зямлі.

І ВОСЬ вынік. Акрамя традыцыйных відаў гародніны (морква, капуста, буракі, агуркі, таматы), у «Брылёва» цяпер вырошчваюць спаржавую фасолю, салодкі перац, розныя віды капусты. На працягу апошніх 10 гадоў КСУП «Брылёва» займае

«У школьным сачыненні шмат гадоў таму агучыў сваю мару: быць старшынёй. Атрымалася».

першае месца ў краіне па вытворчасці гародніны адкрытага грунту.

— Цяплічны камбінат плошчай 9,5 гектара і сёння застаецца эканамічнай апорай прадпрыемства, а яблыневы сад перажывае новае нараджэнне. На плошчы 85 гектараў выраслі маладыя дрэвы на карлікавым прышчэпе. Пабудаваныя сховішчы добра захоўваюць ураджай і забяспечваюць гамяльчан і жыхароў вобласці свежай гароднінай і садавінай круглы год. Вялікая частка прадукцыі — у першую чаргу спаржавая фасоля і зялёны гарошак — перапрацоўваецца на ўласным кансервавым заводзе з самым сучасным абсталяваннем, дзе выпускаецца некалькі відаў сумесяў замарожанай гародніны. Шмат гэтай прадукцыі ідзе на экспарт, — адначае Аркадзь Кобрусеў. — Да нас у гаспадарку на рэспубліканскі семінар «Дзень поля» прыязджаюць замежныя спецыялісты з розных краін. Мы пастаянна эксперыментуем з насеннем найлепшых гатункаў з Галандыі, Даніі, Японіі... Без адсочвання і ўкаранення новых тэхналогій і новых гатункаў не будзе прагрэсу. Для гэтага патрэбна і адпаведная культура земляробства. Усё разам забяспечвае атрыманне такой высокай ураджайнасці.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведваў сельгаспрадпрыемства двойчы: у 1996 і ў 2008 гадах. Тым, што пабачыў на свае вочы, застаўся задаволены. Цікаўлюся, якую культуру ў «Брылёва» засвояць і прапануюць спажыўцу наступнай.

— Ананасы, — усміхаецца дырэктар «Брылёва», — пакуль не збіраемся вырошчваць. І кавуны таксама, бо нявыгадна. Кожнай культуры трэба пэўная колькасць цяпла. Калі яго няма, расліна не паспявае поўнасцю. Мы вырошчваем памідоры, і, вядома, хацелася б рабіць з іх сок і кансерваваць у ім. Але ж наш тамат не мае столькі сухіх рэчываў, колькі, напрыклад, краснадарскі. Таму ўсё трэба пралічваць і рабіць разумна. Пакуль мы застаёмся на традыцыйных культурах, якія ўжо засвоілі, але пайшлі на пашырэнне плошчаў пад цыбулю, гатункі якой будуць змяняцца.

ПРА створаную за гады сацыяльную структуру Аркадзь Тарасавіч гаворыць з асаблівай любоўю. Прыярытэтам для яго заўсёды з'яўляюцца людзі, побач з якімі жыве і працуе:

— Усе нашы работнікі жывуць цяпер у гарадскіх умовах. Мы за гэтыя гады вельмі шмат пабудавалі. Толькі кватэр — каля 800. Усё тут ёсць: гімназія з музычна-харавым ухілам, дзіцячы сад-яслі з басейнам, сельскі дом культуры, медыцынская амбулаторыя агульнай практыкі, кавярня-сталовая, лазневапральны камбінат і новая крама. Па просьбе жыхароў вёскі і з дапамогай іх ахвяраванняў пабудавана царква ў гонар іконы Казанскай Божай Маці.

— Людзі, — гаворыць Аркадзь Кобрусеў, — самая галоўная каштоўнасць сельгаспрадпрыемства.

Вядучых спецыялістаў кіраўнік імкнецца пастаянна накіроўваць у камандзіроўкі, у тым ліку замежныя, — каб вопыту набіраліся. Як вырошчваць спаржавую фасолю, вучыліся, напрыклад, у Чыкага:

— Мы ствараем усе ўмовы для праяўлення творчай ініцыятывы і рознымі спосабамі людзей заахвочваем. У нас нават на планёрках заўсёды адбываецца творчы дыспут. Галоўнае — не аказваць ціск на спецыяліста, даваць яму магчымасць праявіць ініцыятыву. Чалавек перш за ўсё павінен працаваць сам над сабой. Трэба знаходзіць час чытаць, вывучаць нешта новае. Дзякуй Богу, практычна ўсе маю спецыялісты пастаянна знаходзяцца ў пошуку.

НАПРЫКАНЦЫ ў нас з Аркадзем Тарасавічам заходзіць гутарка пра сям'ю і яе ролю ў выхаванні. Ён узгадвае свайго бацьку Тараса Сцяпанавіча, які быў першым трактарыстам у калгасе імя Леніна тады Уваравіцкага (цяпер Буда-Кашалёўскага) раёна. Гэта ён прывучыў працавацца на досвітку, каб больш паспець зрабіць. Бацька браў хлопчыка ў поле памагатым:

— Мы ж раслі, як усе пасляваенныя дзеці. У дзевяць гадоў я працаваў у калгасе. Бульбу аралі, палолі, траву касілі. Не толькі я, усе падлеткі так працавалі. У гаспадарцы ўсе мы зараблялі тады не грошы, а «працадні». У школьным сачыненні шмат гадоў таму агучыў сваю мару: быць старшынёй. Атрымалася. Прафесійную дзейнасць я пачынаў інструктарам, а потым сакратаром райкама камсамола ва Уваравічах, а Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію закончыў завочна ў 1963 годзе.

Тады ж, у юнацтве, Аркадзь Кобрусеў узначаліў адзін з маладзёжных камсамольскіх атрадаў Гомельшчыны, які быў накіраваны на ўборку ўраджаю на цаліне. Дарэчы, 600 чалавек было ў атрадзе. Медаль «За засваенне цалінных земляў» быў першай, але далёка не апошняй узнагародай.

— Мяне ўзнагароды заўсёды натхнялі на новыя дасягненні. Гэта важна — ведаць і адчуваць, што ты на нешта здольны. Між іншым, ва ўсіх маіх узнагародах вялікая заслуга жонкі, — гаворыць Аркадзь Тарасавіч. — Прыходзіш дадому вельмі позна, але заўсёды адчуваеш утульнасць. Адчуваеш, што цябе чакаюць. Марыя Аляксееўна — мой сапраўдны тыл.

«Галоўнае — не аказваць ціск на спецыяліста, даваць яму магчымасць праявіць ініцыятыву».

Кобрусеў адначае, што дзеці бачылі яго не так многа, як хацелася: праца забірала ўвесь час. Куды больш сынам і дачкой займалася жонка. Але разам яны лічылі, што галоўнае правіла выхавання — пастаянная занятасць. Таму сын Аляксандр быў адведзены ў спартыўную школу, дзе і займаўся ўпарта плаваннем:

— У яго ж хвіліны свабоднай не было, ён пастаянна быў заняты. Спадзяюся, што Саша і Ларыса нам з жонкай удзячны за працавітасць, якую мы імкнуліся ў іх выхаваць.

Неверагоднай прагай да ўсяго новага здзіўляе Аркадзь Кобрусеў усіх, хто побач. Ён знаходзіць «разынкі» нават там, дзе іншыя не бачаць. Яго галоўны дэвіз — не спыняцца і ісці наперад.

— Трэба бачыць жыццё такім, якое яно ёсць. І самае галоўнае — ніколі не задавальняцца дасягнутымі поспехамі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *astashkevich@zviazda.by*

Фота аўтара

■ Да ведама

ХТО НЕ БУДЗЕ ПЛАЦІЦЬ ЗА ПЛАТНЫЯ ДАРОГІ?

Указам Прэзідэнта Беларусі ўнесены змяненні ў сістэму збірання платы за праезд па платных дарогах.

Ім прадугледжана распрацоўка і зацвярджэнне новага Палажэння аб выдачы прадаўцом (юрыдычнай асобай ці індывідуальным прадпрымальнікам) часовых нумарных знакаў пры продажы аўтамабіляў, увезеных у Беларусь для рэалізацыі. Пры гэтым такія транспартныя сродкі масай да 3,5 тоны будуць вызваляцца ад платы за праезд па платных дарогах пры дастаўцы іх да месца дзяржаўнай рэгістрацыі, патлумачылі ў прэс-цэнтры Міністэрства транспарту і камунікацый.

Таксама прадугледжана вызваленне ад платы за праезд набытых і ўвезеных у Рэспубліку Беларусь фізічнымі асобамі транспартных сродкаў, не зарэгістраваных на тэрыторыі дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай не большай за 3,5 тоны і прычэпаў, якія яны буксіруюць, цягам 10 дзён з моманту ўвозу (ці з моманту набыцця, калі яны ўвозяцца з тэрыторыі іншых дзяржаў — членаў ЕАЭС).

Указам замацоўваецца вызваленне ад платы за праезд па платных дарогах асоб, якія выкарыстоўваюць транспартныя сродкі, зарэгістраваныя на тэрыторыі Данецкай і Луганскай абласцей Украіны, з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай не большай за 3,5 тоны і прычэпы, што яны буксіруюць. Пералік асоб, вызваленых ад платы, будзе вызначацца па месцы рэгістрацыі транспартнага сродку карыстальніка платных дарог у Данецкай і Луганскай абласцях па рэгістрацыйных знаках і пасведчанні рэгістрацыі. Гэтая катэгорыя грамадзян Украіны, якая трапіла ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, будзе вызваляцца ад платы за праезд па платных дарогах і ў павялічаным памеры

■ Здарэнне

РАБОЧАГА ЗАСЫПАЛА ГРУНТАМ

Пры правядзенні земляных работ на сталічнай вуліцы Скарыны адбыўся абвал грунту. Пад зямлёй аказаўся чалавек.

Здарэнне мела месца бліжэй да вечара на тэрыторыі будаўнічай пляцоўкі, дзе вялася работы па ўкладцы каналізацыі ў траншэі глыбінёй тры метры. У нейкі момант зямля абвалілася на рабочага 1963 года нараджэння. Сталічныя выратавальнікі мусілі даставаць пацярпелага пры дапамозе шанцавага інструмента. З дыягназам «сіндром сціскання, клінічная смерць» яго даставілі ў бальніцу. Як стала вядома пазней, рабочы скапаў. Прычына здарэння высвятляецца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

rs@zviazda.by

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

27 ЖНІЎНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 16 (15775)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

«ІНЖЫР»:

«Бярыце ініцыятыву ў свае рукі»

Трыа, дзе працуюць Марыя Разумава, Таццяна Камарова і Марыя Яковіч — калектыў вядомы па такіх праектах, як украінскае шоу «Х-фактар», Emporio Music Fest by Baigali in Moscow. І гэты спіс можна працягваць. Цяпер дзяўчаты заняты падрыхтоўкай да «Новай хвалі» — конкурс сёлета пройдзе ў Сочы ўвосень. Аднак яны знайшлі магчымасць сустрэцца і пагаварыць пра беларускую эстраду, працоўны энтузіязм і магчымасці для прафесійнага росту.

— Сёлета вы прадстаўляеце Беларусь на конкурсе «Новая хваля». Ці складана было прабіцца?

Таццяна Камарова: «У паўфінале ад Беларусі было сем прадстаўнікоў. Адбор праходзіў у Маскве, бо ў нас ён ужо гады два як не праводзіцца».

Марыя Разумава: «Канкурыравалі мы не канкрэтна з удзельнікамі ад нашай краіны, а з усімі, хто прайшоў папярэднія кастынгі і трапіў у паўфінал. Была задача — здабыць сабе месца сярод паўфіналістаў. Там усё адбываецца па прынцыпе: калі ўдзельнік падабаецца журы, то ён праходзіць далей. Таму прэтэндэнты змагаюцца за тое, каб краіна прагучала на конкурсе».

— А вы адсочваеце, што адбываецца цяпер на розных музычных конкурсах і фестывалях?

Марыя Разумава: «Нядаўна прайшоў «Славянскі базар у Віцебску», за якім я назіраю штогод...»

Таццяна Камарова: «Пра канкурсантаў, якія прадстаўляюць там Беларусь, не магу сказаць, што яны слабыя. Нашы ўдзельнікі вельмі годна абараняюць гонар краіны. У тым ліку і Валерыя Грыбусава. А вось сам фестываль стаў іншым. Я з дзяцінства ездзіла туды з бацькамі. Мы куплялі білеты на конкурс маладых выканаўцаў і назіралі з цікавасцю за ўсім, што там адбываецца. Цяпер жа пасля прагляду выступленняў канкурсантаў ужо не застаецца здзіўлення. А гэты момант, мне здаецца, мае значэнне для гледача».

Марыя Яковіч: «Выканаўцы развіваюцца больш імкліва, чым сам фестываль. Нашы артысты імкнуцца выехаць за мяжу, каб мець магчымасць расці прафесійна. Ёсць беларуская эстрада, на якой заняты пэўныя нішы. А дзе дэманстраваць і шукаць сябе іншым, у тым ліку і маладым выканаўцам — пытанне адкрытае... Просты прыклад: трыа «Інжыр» — калектыў, пра які даведаліся толькі пасля нашага ўдзелу ў шоу «Х-фактара». Хоць да таго мы ўжо існавалі год!

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Добрае пачынанне

СТУДАТРАД... У БЕЛЫХ ХАЛАТАХ

З пачатку ліпеня ў клініках і бальніцах Мінска пачалі працаваць медыцынскія студэнцкія атрады. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» наведалі 5-ю гарадскую клінічную бальніцу і даведаліся, як на практыцы выкарыстоўваюць свае веды студэнты-медыкі.

ЗАПОМНІЦЬ НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

— Толькі накіньце, калі ласка, халат, — папярэджвае мяне адразу, як толькі мы падняліся на трэці паверх, Даша Рындава. — У нас тут з гэтым строга. Самі разумееце, аддзяленне рэанімацыі.

Юрый Лагун.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Даша вучыцца на шостым курсе Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і расказвае, што ўсе студатрадаўцы стараюцца выконваць нават самыя простыя «законы і правілы» бальніцы, у якой працуюць. «Адзін раз запомніш, як трэба, і на ўсё жыццё адкладзецца». А ў іх прафесіі, як кажа дзяўчына, рабіць няправільна забараняецца.

Усяго гэтым летам у сталічных медыцынскіх студатрадах задзейнічана 206 студэнтаў. Для тых, хто ўжо паспеў скончыць трэці курс, у клініках даступныя вакансіі медсясцёр і медбратоў, а для астатніх — медыцынскіх рэгістратараў і санітараў.

Дарэчы, сёлета медыцынскія студатрады працуюць у тэставым рэжыме і ўступіць у іх змогуць толькі студэнты сталічнага медуніверсітэта. Але калі гэты пілотны праект зарэкамендуе сябе, то не выключана, што ўжо наступным летам атрымліваць бонусы ад працы ў студатрадах змогуць таксама студэнты ўсіх беларускіх медыцынскіх ВНУ і каледжаў. А іх абяцаюць нямала. Напрыклад, засяленне ў інтэрнат і значная зніжка (да 60%) на аплату навучання. Найбольш жа актыўных студэнтаў будзе прэміраваць і сам універсітэт.

— Я працую медыцынскай сястрой і выконваю ўсе лячэбныя, гігіенічныя і іншыя ўрачэбныя прызначэнні. Медсястра раздае лекі, ставіць кампрэсы, гарчычнікі, клізмы, бярэ ў хворых матэрыял для лабараторных даследаванняў, сочыць за выкананнем прызначанага хвораму рэжыму, прыёмам лекаў. Падчас свайго дзяжурства сястра павінна сачыць за станам і самаадчуваннем хворых (вымяраць тэмпературу, адсочваць дынаміку пульсу і дыхання), — тлумачыць студэнтка.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Агні вялікага горада

ЯК ПРЫЕЗДЖЫЯ «ЗАВАЁЎВАЮЦЬ» СТАЛІЦУ Ці яна іх?

Мінск — сінонім поспеху для многіх абітурыентаў з правінцыі. Некаторыя лічаць, што калі атрымалася стаць студэнтам сталічнай навучальнай установы, то пабудаваць кар'еру ў гэтым горадзе будзе нескладана. І сапраўды, не ўсе з такіх шчасліўчыкаў вяртаюцца дадому....

Віталь ЦІВУНЧЫК, прыехаў з Бераставіцы, жыве ў сталіцы 8 гадоў:

— Мая адаптацыя праходзіла ў асноўным у рамках універсітэта. Зразумела, прызвычаіцца да вялікай колькасці людзей і шуму вялікага горада было складана... Але дапамагалі мінчане: падказвалі, на якім аўтобусе трэба ехаць, куды лепш пайсці па пакупкі.

Сам сябе не адчуваю мінчанінам на 100 працэнтаў і наўрад ці калі-небудзь адчую. Мінск — горад для працы, і ў той жа час тут шмат прыгожых месцаў, дзе можна цікава правесці час. Але раз на месяц мне абавязкова трэба з'ехаць з гэтых «каменных джунгляў» у родную Бераставіцу ці яшчэ куды. Як бы пафасна гэта не прагучала, але душой я адпачываю толькі дома, там, дзе мае бацькі, дзе я рабіў першыя крокі па жыцці.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
27 08 2015 г.

Сваім розумам

ЖУРНАЛІСЦКІЯ РАССЛЕДАВАННІ... АД ШКОЛЬНІКАЎ

Уявіце сабе сітуацыю. У школьны клас заходзіць педагог і кажа сваім вучням: «Набліжаецца футбольны сезон, і СМІ рыхтуюцца да асвятлення матчаў лігі. Сёння каманды больш нагадваюць кампаніі, якія купляюцца і прадаюцца. Багатыя клубы могуць набываць гульцоў, у той час як бедныя не маюць такой магчымасці. Гэта нярэдка прыводзіць да таго, што матчы футбольнай лігі праводзяцца пераважна ў буйных гарадах — там, дзе больш гледачоў і дзе больш багатых спонсараў. Настаў час заняцца журналісцкімі расследаваннямі».

І ў шведскіх школах вучні з задавальненнем займаюцца на ўроках і па-за школьнымі заняткамі: вывучаюць сярэдні паказчык напаўняльнасці стадыёна падчас гульняў, збіраюць факты пра футбольны клуб, пра тое, ці ёсць у камандзе гульцы, якія «гастралююць» па розных клубах, шукаюць інфармацыю пра памеры іх заробкаў і даходы клубаў, спонсарскую падтрымку. Здавалася б, навошта школьнікам такая інфармацыя? Таму што перад педагогамі пачатковай школы пастаўлена задача — навучыць вучняў шукаць і правільна ацэньваць інфармацыю, атрыманую з розных крыніц (са СМІ, інтэрнэту, сацыяльных сетак і іншых). Напрыклад, усе ведаюць, што ў сеціве ёсць шмат даных (можна там знайсці і інфармацыю пра даходы гульцоў). Але ці можна адназначна даверяць гэтым звесткам?

Ларс-Эрык ХАЛЬ: «Чым больш аргументаў прыводзіць вучань, тым вышэйшая яго адзнака».

НЕ ЎПУСЦІЦЬ ШАНЦ

Ларс-Эрык ХАЛЬ працуе ў пачатковай школе ў невялікім правінцыяльным гарадку. Выкладае грамадазнаўства, геаграфію, гісторыю і асновы рэлігіі. У школе вучацца шмат дзяцей мігрантаў (22 працэнты ад агульнай колькасці), а таксама дзеці з асаблівымі патрэбамі. Дарэчы, пачатковая школа ў Швецыі — шасцігадовая: яе наведваюць дзеці ва ўзросце ад 6 да 13 гадоў.

Педагог шукае для сваіх вучняў самыя цікавыя формы работы, якія стымулююць дзіцячую цікаўнасць, развіваюць аналітычныя здольнасці і творчыя задаткі. Напрыклад, пасля тэрарыстычнага нападу на рэдакцыю французскага часопіса «Charlie Hebdo» на ўроку ў цэнтры ўвагі аказалася карыкатура. З дзецьмі абмяркоўваліся пытанні, ці маюць СМІ права публікаваць інфармацыю, якая можа кагосьці раззлаваць або зняважыць, ці трэба абмяжоўваць свабоду друку, што такое карыкатура. Вучням таксама прапаноўвалася зрабіць газету або часопіс з карыкатурамі на школьнікаў на актуальныя тэмы.

Штодзённая прэса — выдатная крыніца інфармацыі. Педагогі заўважылі, што тэма спорту вельмі захапляе дзяцей, таму яе можна і трэба выкарыстоўваць. Асабліва калі трапляецца артыкул з добрай графікай... Таму Алімпіяда ў Сочы стала для Ларса-Эрыка сапраўдным падарункам. «Які сэнс можа хавацца за загалоўкам «Гульня ў двух тварах», — пацікавіўся ён у сваіх вучняў. — Што меў на ўвазе журналіст?» Высветлілася, што, нягледзячы на інтрыгуючы загаловак, не было ніякага схаванага сэнсу, а размова ў артыкуле ішла пра два віды спорту — хакей і слалам. Дзякуючы Google-maps і ўсталяваным у Сочы вэб-камерам вучні разам са сваім настаўнікам змаглі стаць сведкамі многіх падзей і здзейснілі віртуальную экскурсію па алімпійскай сталіцы.

...А потым усе вучні пісалі лісты спартсменам. Абавязковай умовай было рабіць гэта ад рукі. Такі ліст ніколі не трапіць у спам, і яго складаней праігнараваць. Можна ўявіць сабе радасць дзяцей, якія атрымалі адказы. Тым больш што нацыянальная лыжная зборная (і мужчынская, і жаночая) узяла на алімпіядзе ў эстафеце «золата».

«КАРЦІНКА» І РЭАЛЬНАСЦЬ

На ўроках «Асновы рэлігіі» дзеці вывучалі тэму «Насілле». Адна група вучняў атрымала задачу зрабіць падборку навін са СМІ пра злачынствы ў дарожна-транспартнай сферы. Школьнікі знайшлі інфармацыю пра тое, як 17-гадовы падлетак узяў аўтамабіль сваёй маці, пра жанчыну, якая падазравалася ў кіраванні аўтатранспартным сродкам у нецвярозым стане, і гэтак далей. Другая група шукала інфармацыю пра забойствы, трэцяя — пра крадзяжы, чацвёртая — пра тэрарызм.

Ларс-Эрык кажа, што ў дзяцей, якія акунуліся ў сродкі масавай інфармацыі, узнікла адчуванне, што нас пастаянна акружае гвалт, а свет — вельмі небяспечны. Давялося патлумачыць ім, што калі чытаць і глядзець СМІ, то і сапраўды становіцца страшна жыць, бо медыя ствараюць пэўную «карцінку».

— Мая маці сказала ўнуку, калі той пайшоў вучыцца ў гімназію: «Будзь асцярожны — там прадаўцы наркотыкаў хаваюцца за кожным вуглом». Таму што мая маці жыве ў свеце, створаным СМІ. Дастаткова адной навіны пра выяўленне наркотыкаў у школе, як многія ўжо вераць, што наркадылеры там прапісаліся, — дзеліцца сваім меркаваннем настаўнік.

Тэматычныя падборкі навін вучні робяць для таго, каб потым паразважаць пра тое, як яны ствараюцца, пра правы чалавека, законы і пра няпісаныя правілы суіснавання ў грамадстве: ад сям'і і школы яны пераходзяць да больш глабальных рэчаў — краіна, свет. На ўроках па асновах рэлігіі разважаюць пра каштоўнасць жыцця кожнага чалавека, пра тое, што людзі павінны жыць у згодзе і паразуменні.

Чым больш аргументаў можа прывесці вучань, чым больш аспектаў у сваім адказе ён ахоплівае, тым вышэйшая яго адзнака. Медыякампетэнтнасць ацэньвацца па чатырохбальнай шкале: на першым узроўні (факты) вучні павінны валодаць асновай пабудовы новых ведаў, на другім (уменне) — знаходзіць інфармацыю, прадстаўляць яе ў новай форме; на трэцім — разумець, пра што ідзе гаворка ў тэксце, вылучаць галоўную думку. На чацвёртым, самым высокім узроўні (паглыбленае разуменне), — упэўнена карыстацца ведамі, рабіць ацэнку любога медыяпаведамлення. Школьнікаў вучаць размяжоўваць артыкулы, дзе прысутнічае меркаванне журналіста, і артыкулы, дзе прыводзяцца толькі факты, каб бачыць розніцу і вучыцца самастойна рабіць высновы. Дарэчы, у вучэбным плане шведскай школы зафіксавана, што вучні павінны крытычна ставіцца да інфармацыі і ўмець аналізаваць яе, пачынаючы з першага года навучання.

ВЫБРАЦЬ НАВІНУ ТЫДНЯ

Штогод вучні трэціх, шостых і дзевятых класаў удзельнічаюць у нацыянальным тэсціраванні. Яно праводзіцца адначасова па ўсёй краіне, ніякай папярэдняй уцечкі інфармацыі не дапускаецца. Школьнікам забараняецца карыстацца на тэсціраванні мабільнымі тэлефонамі. Усе дзеці атрымліваюць аднолькавыя заданні, якія ацэньваюцца па аднолькавых крытэрыях незалежнымі экспертамі. Тэст ахоплівае матэматыку, шведскую і англійскую мовы.

Адно з заданняў тэсціравання — напісаць тэкст у выглядзе навіны або нейкае разважанне, эсэ. Пісьмовая частка тэксту правярае здольнасці вучня выказваць свае думкі пісьменна, лагічна і зразумела. Правяраецца таксама і разуменне праслуханага тэксту.

— Я заўсёды кажу: «Дайце дзіцяці 10 хвілін на чытанне газеты і не задавайце яму пытанні», — падкрэслівае Ларс-Эрык. — Не мая задача — гаварыць, што правільна, а што няправільна. Я, як педагог, павінен толькі агучыць аргументы «за» і «супраць».

Настаўнік можа прапанаваць вучням выбраць навіну тыдня. Для гэтага трэба штодня ўважліва чытаць загалоўкі першай паласы газет і тое, што зацікавіла, выразаць... Пасля гэтага кожны вучань піша свой тэкст пра «сваю» навіну тыдня, але не пераказвае газетны матэрыял, а перадае інфармацыю сваімі словамі, расстаўляе свае акцэнты. У канцы тыдня школьнікі зачытваюць сваю навіну перад аднакласнікамі, пасля чаго ідзе абмеркаванне: вучань абавязкова тлумачыць, чаму ён спыніў свой выбар менавіта на гэтай навіне і чаму яна можа прэтэндаваць на званне «навіна тыдня».

Не трапіць у «сеткі»

Напісаў на «сцяне» — прачыталі ўсе...

Хлопчык пакідае ў сацыяльнай сетцы паведамленне адной дзяўчынцы: «Ты такая дурніца, таму лепш ідзі і застрэлься!» Ці вось яшчэ адзін пост 17-гадовай дзяўчыны: «Сёння я засталася дома, і заўтра я буду дома, бо няма жадання і сіл ісці ў школу. Я лепш пасяджу на сонейку...»

Ёран АНДЭРСАН, настаўнік грамадазнаўства, гісторыі і геаграфіі, медыяпедагог з 20-гадовым стажам, расказвае:

— Я часта цікаўлюся ў школьнікаў: «Калі ты выходзіш у сеціва, то павінен усё цярпець?» І 15-гадовыя падлеткі даюць, як правіла, станоўчы адказ: «Так, трэба цярпець». Яны лічаць, што існуе вялікая розніца паміж тым, што можна сказаць чалавеку ў рэальным жыцці і што можна сказаць яму ў сеціве. А я тлумачу, што насамрэч няма ніякай розніцы — нельга нікога абражаць ні ў жыцці, ні ў сацыяльных медыя».

Сацыяльныя сеткі ўжо сталі неад'емнай часткай нашага жыцця. Facebook — трэцяя па колькасці «жыхароў» «краіна» на планеце. Сацыяльныя медыя ўсё часцей выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе, хоць асцярогі наконт эфектыўнасці такога метаду застаюцца. У Францыі, напрыклад, з дапамогай Twitter некаторыя настаўнікі вучаць дзяцей чытаць і пісаць. У Паўднёвай Карэі «балбатаць» ў сацыяльных сетках падчас урока — абсалютна нармальна. Ёсць нават спецыяльны клас, дзе гэта адбываецца. Школьнікі звязваюцца са сваімі равеснікамі ў іншай краіне і расказваюць ім пра школьнае жыццё. Высокія тэхналогіі дапамагаюць вывучаць замежную мову. У класе дазваляецца выкарыстоўваць Skype, абменьвацца фатаграфіямі ў Facebook, але пад строгім кантролем педагогаў.

Ёран АНДЭРСАН: «Журналісты пішуць праўдзіва, а ў сетцы можаш напісаць ўсё, што заўгодна, і не несці адказнасць».

Нядаўна ААН абвясціла права на ананімнасць у інтэрнэце. Але ёсць розныя пункты погляду на гэты конт.

— Я прапаную дзецям абмеркаваць, наколькі важная ананімнасць, калі мы выходзім у інтэрнэт. Гэта станоўчы або адмоўны момант? — кажа Ёран. — Менавіта ў магчымасці застацца ананімным і хаваецца адрозненне паведамленняў у сацыяльных медыя ад сапраўднай журналістыкі. Пад кожным журналісцкім артыкулам стаіць сапраўднае імя і прозвішча аўтара, яго электронны адрас ці тэлефон. Журналісты вымушаны пісаць праўдзіва, бо на наступны дзень іх атакуюць званкамі і паведамленнямі ўважлівыя чытачы, не згодныя з аўтарам. А ў сетцы можаш напісаць ўсё, што заўгодна, і не несці за гэта адказнасць.

Педагогі канстатуюць, што цкаванне школьнікаў цяпер перамясцілася з двара ў сацыяльныя сеткі. **Ліза Б'ЮРВАЛЬ, журналіст, вядомы ў Швецыі эксперт і аўтар кнігі па мове нянавісці ў інтэрнэце**, кажа: «Мы, дарослыя, павінны зрабіць усё, каб абараніць дзяцей ад пагроз, абразлівых паведамленняў, гвалту, уцягвання ў розныя небяспечныя арганізацыі і групоўкі. У інтэрнэце вельмі лёгка сустрэцца з дэструктыўнай прапагандай па распальванні сацыяльнай і нацыянальнай варожасці. Ёй займаюцца прафесіяналы, якія па-майстэрску маніпулююць свядомасцю і пачуццямі людзей».

— На жаль, але часы, калі свае думкі падлеткі даверялі дзённікам, што ляжалі ў сталах, прайшлі, — дзеліцца сваімі думкамі **журналіст газеты «Барометр» Эмілі ЛУНД**. — Цяпер 16-гадовая дзяўчына, якая перажывае з прычыны магчымай цяжарнасці, дзеліцца сваёй бояззю не з сяброўкамі, а ў сацыяльнай сетцы. Таму я заўсёды кажу моладзі: «Нічога не пішыце, калі вы чымсьці засмучаны ці раззлаваліся, бо ёсць людзі, якія не жадаюць вам дабра і могуць выкарыстаць гэтую інфармацыю супраць вас. Падальюць масла ў агонь, і вам зробіцца яшчэ горш. Раю не пісаць нічога, што не павінен прачытаць настаўнік, што не павінны прачытаць вашы бацькі і сваякі ці ваш будучы працадаўца. Калі той прачытае пост дзяўчыны, якая лянуецца хадзіць у школу, то наўрад ці ён возьме яе на працу нават на час летніх канікул. Інфармацыю на патэнцыяльных работнікаў кампаніі збіраюць у тым ліку і ў сацыяльных сетках».

Дарэчы, педагагічная грамадскасць у Швецыі абмяркоўвала нядаўна пытанне, ці могуць настаўнікі знаходзіцца ў адной сацыяльнай сетцы са сваімі вучнямі. І пастанавіла — з вучнямі ў сеціве «не сябраваць»!

Сацыяльная сетка Facebook стала найбольш папулярным інструментам для пераходу на сайты навін, чым пошукавая сістэма Google. Пра гэта паведаміла амерыканскае выданне Fortune, грунтуючыся на звестках аналітычнай кампаніі Parse.ly. «На долю сацыяльных сетак прыпадае 43% усяго трафіку для анлайн-медыя, у той час як на пошукавыя сістэмы — 38%», — адзначае выданне. Апошні раз Facebook абышоў Google па гэтым паказчыку ў кастрычніку 2014 года.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@mail.ru
Фота аўтара.
Мінск—Кальмар—Мінск.

З першых вуснаў

«ЗАДАЧА ДЗЯРЖАВЫ — СТВАРЫЦЬ УМОВЫ»

УСЁ АСТАТНЯЕ — АДКАЗНАСЦЬ МОЛАДЗІ

Банальна, але факт: моладзь — будучыня краіны. Пра тое, як апошняя клапоціцца пра сваю будучыню, мы вырашылі пагутарыць з Наталляй ПШАНІЧНАЙ, кіраўніком упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі.

— Вы адносна нядаўна занялі гэтую пасаду. Як сябе адчуваеце на ёй? Што вы ўжо паспелі зрабіць і якія планы маеце?

— На пасаду кіраўніка ўпраўлення па справах моладзі я трапіла з пасады намесніка кіраўніка ўпраўлення па справах моладзі, таму гэта быў даволі плаўны пераход. Так атрымалася, што маё прызначэнне амаль супала з абвяшчэннем Года моладзі. Ён дазваляе прыцягнуць увагу да праблем моладзі, дае магчымасць сканцэнтравацца на іх. Прычым не толькі Міністэрству адукацыі, але і ўсім дзяржорганам, структурам, якія так ці інакш маюць дачыненне да моладзі.

«Не кожная краіна прадастаўляе студэнтам інтэрнаты. Мы ж да гэтага ставімся як да належнага. Больш за тое, мы імкнёмся да таго, каб кожны студэнт, каму гэта неабходна, жыў у інтэрнаце».

Гэты год мы пачалі 42-м з'ездам БРСМ. Менавіта там упершыню прагучала ідэя зрабіць сімвалам нашай Перамогі яблыневую кветку. Праект падтрымала ўся краіна.

Яшчэ адным важным праектам стаў форум рэспубліканскага маштабу ў Горках, дзе знаходзіцца адна з найстарэйшых навучальных устаноў. Гэта важнае мерапрыемства, бо адзін з прынцыпаў якаснай маладзёжнай палітыкі — удзел самой моладзі ў прыняцці рашэнняў. На форуме было каля 600 удзельнікаў. Там праводзілася выстава найлепшых маладзёжных праектаў. Ладзіліся круглыя сталы па актуальных пытаннях, напрыклад, па самакіраванні, прайшоў фінал рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года».

Раскажу таксама пра планы нарматворчай дзейнасці на сёлетні год. Ужо распрацавана стратэгія дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі да 2020 года. Па нашых папярэдніх маніторынгах было відаць, што краіне неабходна нейкая канцэпцыя па валанцёрскім руху. Ён пашыраецца, але няма прававой асновы. Мы вырашылі, што для першага кроку дастаткова канцэпцыі развіцця валанцёрскага руху. Сёлета таксама будзе прымацца канцэпцыя развіцця самакіравання, гэта вельмі важна ва ўмовах уваходу ў Балонскі працэс. Шмат чаго мы ўжо рэалізуем. Напрыклад, пры міністры адукацыі створаны рэспубліканскі студэнцкі савет, у які ўвайшлі 54 чалавекі — прадстаўнікі ад кожнай ВНУ. Сёлета мы зрабілі важны крок у плане міжнароднага супрацоўніцтва: у чэрвені падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве ў сферы дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі паміж краінамі Вышаградскай групы (Польшча, Чэхія, Славакія, Венгрыя) і пяццю краінамі Усходняга партнёрства. Кожная краіна разумее, што, нічога не ўкладваючы ў маладзёжную палітыку, цяжка дамагчыся вынікаў. Прыродныя рэсурсы вычарпальныя, ёсць краіны, у якіх іх няма, таму трэба ўкладваць сродкі ў чалавечы капітал. Мне здаецца, наша краіна павінна ісці менавіта па гэтым інавацыйным шляху, укладаючы сродкі і сілы ў тым ліку ў інтэлект і развіццё моладзі.

— На вашу думку, умовы для атрымання адукацыі ў Беларусі дастаткова спрыяльныя?

— Безумоўна. Я не стамляюся паўтараць: хацелася б, каб наша моладзь у першую чаргу цаніла тое, што ў яе ёсць. Вучоба сёння абсалютна даступная, да таго ж створана цэлая сістэма дадатковай адукацыі: можна знайсці сабе занятак на любы густ. Сёння з кожнай школы (пры ўмове, што ты сам гэтага хочаш) можа выйсці адукаваны, інтэлектуальна развіты, творчы малады чалавек. Ва ўстановах вышэйшай адукацыі выбар спецыяльнасцей больш чым дастатковы. З прафесіяй вызначыцца хіба толькі ўнутрана складана. Мы арыентуем моладзь у тым ліку і на рабочыя спецыяльнасці, бо сістэма прафадукацыі сёння дае вельмі якасную падрыхтоўку.

Таксама не кожная краіна прадастаўляе студэнтам інтэрнаты. Мы ж да гэтага ставімся як да належнага. Больш за тое, мы імкнёмся да таго, каб кожны студэнт, каму гэта неабходна, жыў у інтэрнаце. Гэта не ўмова Балонскага працэсу, а ініцыятыва нашай сацыяльна арыентаванай краіны. Мэтанакіраваны малады чалавек сёння можа дамагчыся ўсяго. Вядома, чакаць, што табе прынясуць усё гатовае, — гэта няправільны, тупіковы шлях. Але, сустракаючыся з маладымі людзьмі ў іх асяродку, я бачу, што яны ў большасці матываваныя. Трэба проста засяродзіцца, рэальна ацаніць свае магчымасці і намеціць планы. А дасягнуць поспеху можна ў любой справе. Толькі трэба, каб грамадства разумела: паспяховы чалавек — гэта той, хто мае сям'ю, працу, пэўны дабрабыт, сяброў, пазітыўны погляд на свет, перспектывы, займаецца сваім самаразвіццём. Той, хто ўсяго дамогся ўласнай працай і інтэлектам. Менавіта гэты вобраз трэба папулярызаваць, у тым ліку з дапамогай СМІ.

— Распавядзіце пра найбольш цікавыя праекты ў рамках Года моладзі.

— Яшчэ ў мінулым верасні БРСМ быў распачаты праект «Адкрыты дыялог»: дыялог моладзі з прадстаўнікамі сваёй ВНУ, школы, кіраўнікамі міністэрстваў, ведамстваў, з мясцовымі органамі ўлады. Праект настолькі прыжыўся ў маладзёжным асяродку, што мы вырашылі не завяршаць яго 42-м з'ездам, як планавалі першапачаткова.

З улікам палітычнай важнасці гэтага года па ініцыятыве БРСМ запускаецца праект «Выбірай.by!», мэта якога — павышэнне сацыяльнай адказнасці моладзі. Ад «Адкрытага дыялогу» мы б хацелі перайсці да дэбатаў, больш сканцэнтраванай формы абмеркавання.

«100 ідэй для Беларусі» — праект, які працуе не першы год. Зараз ён выходзіць на міжнародны ўзровень і будзе называцца «100 ідэй для СНД». Яго ўдзельнікі рыхтуюць міні-праекты, якія ў 2016 годзе прэзентуюць у Беларусі, бо менавіта мы былі ініцыятарамі.

На прасторы СНД мы таксама ствараем сетку даследчыцкіх структур. Пасля развалу Саюза кожная краіна праводзіць даследаванні па пытаннях дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі аўтаномна, а было б правільна звязаць паміж сабой адпаведныя структуры. У БДУ ёсць Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў. Чаму б яго не звязаць з такім жа цэнтрам, напрыклад, у Арменіі, Азербайджане, Казахстане і іншых краінах? Ініцыятыва была падтрымана. У сетку ўвайшлі 28 структур. У выніку мы будзем мець вынікі па ўсіх краінах-удзельніцах і зможам параўнаць, прааналізаваць.

Яшчэ адзін важны прынцып — міжведамаснае ўзаемадзеянне. Такія паняцці, як маладая сям'я, працоўная моладзь, не дазваляюць нам замкнуцца ўнутры сістэмы адукацыі. Таму мы выходзім на розныя ўзроўні ўзаемадзеяння. Здароўе, фарміраванне здаровага ладу жыцця — тэма супрацоўніцтва з Міністэрствам аховы здароўя, маладзёжны турызм — з Міністэрствам спорту і турызму, па пытаннях бяспекі, злачыннасці нашы першыя саюзнікі — сілавыя структуры.

«Ва ўстановах вышэйшай адукацыі выбар спецыяльнасцей больш чым дастатковы. З прафесіяй вызначыцца хіба толькі ўнутрана складана. Мы арыентуем моладзь у тым ліку і на рабочыя спецыяльнасці, бо сістэма прафадукацыі сёння дае вельмі якасную падрыхтоўку».

— Чым, на вашу думку, сённяшняе пакаленне адрозніваецца ад папярэдніх?

— Часта можна пачуць: «Моладзь ужо не тая». Насамрэч, кожнае наступнае пакаленне лепшае, чым папярэдняе з вельмі простай прычыны: у яго ёсць вопыт папярэдніх пакаленняў, болей ведаў, вальнейшы доступ да інфармацыі. Адпаведна, вызваляецца час, які можна правесці з розумам. Матываваны чалавек патраціць яго на развіццё, самаўдасканаленне.

— Якія асноўныя праблемы ў сучаснай моладзі? Як вашы структуры дапамагаюць іх вырашаць?

— Маладыя людзі напачатку не маюць адукацыі, уласнага жылля, працы. Гэтыя рэчы і вызначаюць іх патрэбы. Яшчэ адна праблема — працаўладкаванне, пошук першага працоўнага месца. Тут дзяржава якраз клапоціцца пра моладзь. Што б ні казалі, размеркаванне — вельмі важная сацыяльная падтрымка. Што да жылля, дзяржава прадастаўляе права льготнага крэдытавання стыпендыятам двух фондаў — таленавітай і адоранай моладзі, а таксама арэнднае жыллё. У летні перыяд у студэнтаў ёсць магчымасць зарабіць грошы дзякуючы студатрадаўскаму руху. Самая важная задача дзяржавы — стварыць умовы. Усё астатняе — адказнасць маладога чалавека. Таму заклікаю не марнаваць час, бо потым яго нічым не кампенсуеш. І я ўпэўнена, што беларуская моладзь гатова траціць сваю энергію на ўласнае развіццё і развіццё краіны.

Тамара МІНЮТКА.

Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

Рэспубліканскі конкурс «Студэнт года»: за ганаровы тытул змагаліся восем найлепшых студэнтаў, а перамагла пяцікурсніца Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандра МАЛАКАНАВА.

Рабі, як я

БЫЦЬ НА АДНОЙ ХВАЛІ

Героямі нашых публікацый часта з'яўляюцца актыўныя маладыя людзі, якім ёсць што расказаць пра сябе і свае справы. Сёння наша суразмоўца — Юлія ЗЯНЕВІЧ, першы сакратар Уздзенскай раённай арганізацыі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, якую яна ўзначальвае ўжо чацвёрты год.

— З чаго пачынаўся ваш удзел у маладзёжным руху?

— Яшчэ вучаніцай дзявятага класа атрымала членскі білет Саюза моладзі Беларусі. Гэты момант мне ўрэзаўся ў памяць не проста так. Пазней я звязала сваё жыццё з маладзёжным грамадскім аб'яднаннем. Пасля заканчэння факультэта беларускай філалогіі БДУ прыйшла працаваць у Ліцвянскі дзіцячы садок. Адсюль мяне запрасілі паспрабаваць свае сілы на пасадзе першага сакратара РК БРСМ.

— Як далося рашэнне аб пераходзе?

— За студэнцкія гады ў мяне сфарміравалася адэкватнае стаўленне да слова «кар'ера». Планаваць свой далейшы лёс і рухацца па кар'ернай лесвіцы — гэта нармальна. Сёння я не шкадую аб сваім рашэнні.

Спачатку выконвала абавязкі першага сакратара. На новай пасадзе пашырыўся спектр стасункаў, адкрыліся новыя далягляды. З іншага боку, ты пачынаеш разумець, што павінна адказваць за кожнае сваё слова, кожнае прынятае рашэнне, каб калегі прыслухоўваліся да цябе. Прыемна, што людзі, з якімі я працую, мяне разумеюць.

— Чым найперш захапляе праца?

— У маім падпарадкаванні значная колькасць маладых людзей, у якіх свае інтарэсы, ідэі, праекты. Пастаянна ладзіцца многа розных акцый, мерапрыемстваў, што трэба арганізаваць. Здараецца, прыходзіш дадому апоўначы, часам працуеш у выхадныя дні і святы.

Але, па-першае, гэта вопыт работы ў камандзе, вопыт кіраўніка. Па-другое, новыя знаёмствы, справы і праекты. Патрэцяе, калі працуеш з моладдзю, адчуваеш сябе заўсёды бадзёрым, энергічным.

— Цяжка знайсці паразуменне з маладымі людзьмі?

— Вельмі важны асабісты прыклад. Калі ты сам уключаешся ў справу, то хлопцы і дзяўчаты бачаць у табе роўнага. Не менш важна паспяваць за ўсімі зменамі, якія адбываюцца ў маладзёжным асяроддзі. Калі раней у мяне не даходзілі рукі да сацыяльных сетак, то сёння праца ў інтэрнэт-прасторы — гэта неад'емная частка ўзаемадзеяння з маладымі людзьмі. Нам удаецца быць з імі на адной хвалі.

Раённая арганізацыя БРСМ налічвае 890 юнакоў і дзяўчат ва ўзросце ад 14 да 31 года. Гэта самая крэатыўная і ініцыятыўная моладзь, якая займае актыўную жыццёвую пазіцыю, імкнецца быць карыснай грамадству і сваёй краіне. У нас ёсць шмат ідэй па актыўным уключэнні працоўнай моладзі ў БРСМ, мы робім усё магчымае, каб у арганізацыю ўступалі свядома, ішлі з пэўнымі ідэямі і мэтай зрабіць штосьці карыснае для краіны. Хачу пажадаць усім маладым людзям быць вольнымі, ініцыятыўнымі і не баяцца праяўляць сябе.

Дар'я ЗЯНЬКОВІЧ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
27 08 2015 г.

Адпачыць і зарабіць

«ПРЫКЛАЛІ РУКІ» ДА ГІСТОРЫІ «ДЫНАМА»

...Некалькі МАЗаў адзін за адным праязджаюць прахадную і накіроўваюцца ў бок былога рынку. На вялікай пляцоўцы, якую некалі займалі кіёскі і палаткі гандляроў, цяпер размяшчаюцца будматэрыялы. Тры бегуны, што раней навісалі над выхадам са стадыёна, займаюць больш устойлівае месца — на зямлі. Алімпіяда-80, поспехі футбольнага «Дынама» і першыя самастойныя крокі нацыянальнай зборнай — усё гэта адбывалася тут. Цяпер стадыён «Дынама» знаходзіцца на рэканструкцыі, якую ў тым ліку дапамагае праводзіць і моладзь: сёлета на аб'екце працуе зводны беларуска-расійска-ўкраінскі будатрад. Ужо напрыканцы змены карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» наведаліся ў госці да хлопцаў.

На пляцоўцы, дзе футбольныя азы спасцігалі Валянцін Бялькевіч і Аляксандр Глеб, разгорнуты своеасаблівы будаўнічы гарадок з дзясяткаў вагончыкаў-бытовак. У адной з іх мы і сустракаемся з двума байцамі са зводнага атрада імя 70-годдзя Перамогі — камандзірам Пятром Пільнікам і яго адзіным цяпер падначаленым Аляксеем Караленем *(на здымку)*. Справа ў тым, што расійскія і ўкраінскія студэнты некалькі дзён таму скончылі сваю працу і паехалі дадому, беларускіх жа ў дзень нашага прыезду накіравалі на іншыя аб'екты ў сталіцы — іх дапамога на «Дынама» ўжо не так запатрабавана.

— У студатрадаўскі рух я трапіў даволі даўно, — распавядае Пётр, які цяпер вучыцца на пятым курсе факультэта энергетычнага будаўніцтва Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. — Прыкладна з другога курса пачаў летам працаваць на студэнцкіх будоўлях. Першым маім аб'ектам быў Палац Незалежнасці на праспекце Пераможцаў, потым удзельнічаў у рэканструкцыі спарткомплексу «Раўбічы», дзе я ўжо стаў камандзірам атрада. Ну і вось чарговая будоўля — стадыён «Дынама». На такі важны аб'ект нас накіравалі дзякуючы рэктару БНТУ Барысу Хрусталёву. Калі параўноўваць з іншымі месцамі, дзе давялося папрацаваць, то тут мне падабаецца больш. У першую чаргу, з прычыны парадку — усе бытоўкі новыя, са шклопакетамі, у іх заўсёды ёсць вада і электрычнасць, непадалёк душ, які ратаваў нас ад спёкі. Таксама радуе стаўленне начальства: усе прафесіяналы найвышэйшага ўзроўню, якія разумеюць, што працуюць студэнты. Таму, калі робім нейкую памылку, нам спакойна тлумачаць без лішніх эмоцый.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Сваю працу зводны атрад імя 70-годдзя Перамогі распачаў у першай дэкадзе ліпеня. У яго ўвайшлі адзінаццаць беларускіх студэнтаў, столькі ж украінскіх і два расійскія. Беларуская частка ў асноўным была прадстаўлена студэнтамі БНТУ. Усіх хлопцаў засялілі ў студэнцкі інтэрнат за пяць хвілін хады — на Кастрычніцкай вуліцы. Па словах Пятра, атмасфера ў атрадзе была выключна сяброўская: студэнты ўвесь вольны час бавілі разам і за месяц пасябравалі. Дарэчы, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі распрацаваў для ўсіх будатрадаўцаў спецыяльную бясплатную праграму адпачынку — хлопцы ездзілі ў аквапарк, былі на экскурсіі ў Брэсцкай крэпасці, Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, на Мінскім трактарным заводзе, адпачывалі ў адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Лідар» пад Мінскам: гулялі ў футбол, рабілі шашлык. Карацей, не сумавалі. Вядома, паспелі і падзяліцца адзін з адным досведам, бо ўсе байцы атрада вучацца на будаўнічых спецыяльнасцях.

— Мне не хацелася траціць лета ўпустую, — гаворыць другакурснік спецыяльнасці «Прамысловая электроніка» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Аляксей Караленя. — Вырашыў падзарабіць грошай, каб дапамагчы бацькам з аплатай маёй вучобы. Пётр — мой сусед, ён і прапанаваў далучыцца да будатрада. Мяне натхніла тое, што з'явіўся шанц, у некаторым сэнсе, дакрануцца да гісторыі, бо аб'екту амаль сто гадоў. І не толькі дакрануцца, але і сваімі рукамі распачаць яе новую старонку. Праўда, футболам я не надта цікаўлюся, мне па душы хакей.

Цяпер на стадыёне ідзе дэмантаж старых канструкцый — разборцы падлягае большая частка комплексу. Працуюць у асноўным машыны, таму людзей на пляцоўцы зусім няшмат. Ад старога «Дынама» нашчадкам застануцца толькі сцены, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць. Гэта абумовіла і віды працы, якія даверылі будатрадаўцам.

— Усіх нас аформілі як дапаможных рабочых, — распавядае Пётр Пільнік. — Таму займаемся самай рознай працай — ад прыбірання тэрыторыі і мантажу агароджаў да ўсталявання апалубкі пад фундамент. Працуем з васьмі раніцы да пяці вечара. Тыя, хто заставаўся на падоўжаныя змены (яшчэ дзве гадзіны) і выходзіў па суботах, атрымалі больш як па 8 мільёнаў. Хто асабліва не перанапружваўся, зарабіў па 6. Украінцы былі вельмі задаволеныя, бо ў іх цяпер цяжка зарабіць столькі за месяц.

Будатрад імя 70-годдзя Перамогі будзе працаваць на «Дынама» да апошняга дня лета, праўда, ужо без замежных гасцей. Нашы хлопцы кажуць, што на гэтым іх праца тут наўрад ці скончыцца. Пятра зусім хутка чакае размеркаванне, і ён плануе пагаварыць з начальнікам будоўлі, каб сённяшняга студэнта ўзялі на аб'ект ужо ў якасці маладога спецыяліста. Хлопец хоча паўдзельнічаць у працы, калі на стадыёне будуць узводзіцца новыя канструкцыі. Аляксей жа ўпэўнены, што і праз год летні адпачынак для яго заменіць праца ў будатрадзе — надта запамінальныя эмоцыі ён атрымаў тут сёлета.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

СТУДАТРАД... У БЕЛЫХ ХАЛАТАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

І гэта яшчэ не ўвесь спіс абавязкаў, якія выконвае Даша. Дзяўчына прызнаецца, што спачатку было вельмі цяжка.

— У першы мой працоўны дзень памёр пацыент. Вядома, я разумею, што гэта здарылася не па маёй віне (выпадак быў вельмі складаны), але непрыемны асадак застаўся. Увогуле, складана ўліцца ў рабочы працэс. Ад цябе патрабуюць зрабіць і тое, і гэтае, а ты разумееш, што яшчэ не справіўся з самым першым даручэннем, — узгадвае Даша.

На шчасце, як кажа студэнтка, цяпер яна ўжо спраўляецца са сваёй работай. Ёсць, зразумела, нейкія пытанні, але адказы на іх можна знайсці ў вопытных урачоў і медсясцёр, якія заўсёды знаходзяцца побач са студэнтамі.

ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА — РОЗНЫЯ РЭЧЫ

— Я хачу стаць хірургам. Так, зараз мае абавязкі медбрата маюць мала агульнага з «прафесіяй мары», але гэты досвед лішнім не будзе. Непатрэбных ведаў у медыцынскай сферы проста не бывае, — упэўнены Юрый Лагун.

Хлопец таксама вучыцца на шостым курсе Белмедуніверсітэта.

— Ведаеце, што больш за ўсё мяне ўразіла падчас працы? Тое, наколькі не супадаюць тэорыя ў падручніку і практыка ў бальніцы. Чытаеш у кнізе адно, а ў палаце бачыш зусім іншае. Увогуле, без практыкі ўсе тыя веды з універсітэта пустыя, — дзеліцца студэнт.

Юра плануе працаваць і падчас вучобы. Прызнаецца, што сумяшчаць работу і заняткі ва ўніверсітэце будзе складана. Але такога вопыту, як у бальніцы, не набярэшся нідзе. У адміністрацыі медустановы студатрадаўцы на добрым рахунку. Энергічныя, адказныя, старанныя работнікі заўсёды патрэбны. Дзяжурствы і выхадныя ў студэнтаў-медыкаў — па графіку. Зарплата і прэміі — як у штатных супрацоўнікаў.

— Хлопцы і дзяўчаты ў нас разумныя, уважлівыя і, галоўнае, «жывыя». У іх «вочы гараць», так яны хочуць усяму навучыцца! А калі ёсць жаданне — будзе і вынік, — лічыць галоўная медсястра Святлана Калбенева.

ЦЯЖКА НАЙПЕРШ МАРАЛЬНА

Шасцікурсніца Анжаліка Бялоцкая працуе ў аддзяленні хірургіі. На размову з намі дзяўчына адвяла літаральна дзесяць хвілін. Анжаліка прызнаецца, што ў тыя свабодныя моманты, якія вельмі рэдка з'яўляюцца на рабоце, яна проста хоча пасядзець у цішыні.

— Для мяне праца цяжкая маральна, а не фізічна. Амаль кожны дзень прыходзіцца бачыць хворых, знясіленых людзей. Згадзіцеся, малюнак не самы прыемны. А яшчэ становіцца горш, калі ты не ў сілах дапамагчы, — прызнаецца студэнтка.

Дзяўчына лічыць, што яе эмацыянальнасць і ўспрымальнасць з часам пройдзе. Галоўнае — не пераставаць займацца любімай справай. Анжаліка чытае шмат медыцынскай літаратуры і спрабуе прымяняць новыя веды на працы.

— Займацца з дзецьмі мне вельмі падабаецца. Ад іх выходзіць столькі цяпла і шчырасці! Але ў той жа час да дзяцей патрэбен нейкі іншы падыход, чым да дарослых, — расказвае дзяўчына.

Анжаліка канстатуе, што размаўляць з роднымі хворых няпроста. Звычайна гэта робіць урач, але нават збоку зразумела, якім тонкім псіхолагам трэба быць. Студэнтка лічыць, што такіх каштоўных парад, якія можна пачуць у бальніцы, не знойдзеш ні ў адным падручніку.

Студэнты-медыкі прызнаюцца, што ім вельмі прыемна, калі іх працу заўважаюць. Пачуць пахвалу ад калегі-ўрача — як узнагарода. Атрымаць «дзякуй» ад пацыентаў ці іх родных — стымул працаваць далей.

— Адна пацыентка прысвяціла мне верш. Словы ў ім простыя, але такія цёплыя. Гэты падарунак я захоўваю, — дзеліцца Даша Рындава.

Бываюць і такія сітуацыі, калі ўзрост студэнтаў-медыкаў насцярожвае людзей. Маўляў, яшчэ маладыя, нявопытныя. Але ўрачы кажуць, што чулае кіраўніцтва і жаданне вучыцца зробяць сваё, і з сённяшніх студэнтаў абавязкова вырастуць сапраўдныя прафесіяналы ў сваёй справе.

Кацярына АСМЫКОВІЧ.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

«Практычныя» канікулы

Ты ў «Сузор'і», ці «Ніка» для лепшых!

Сёлета для работы ў Нацыянальным дзіцячым аздараўленча-адукацыйным цэнтры «Зубраня» былі сфарміраваны зводныя атрады БДПУ «Сузор'е» і «Сузор'е-1». Аб'яднанне самых лепшых студэнтаў розных факультэтаў забяспечыла ўнікальнасць гэтага праекта.

Як адзначаюць у БДПУ, работа з дзецьмі пад кіраўніцтвам педагагічных кадраў «Зубраняці» садзейнічала развіццю ў студэнтаў прафесійна-педагагічнай кампетэнтнасці.

Удзельнікі педагагічных атрадаў вывучалі, у прыватнасці, асаблівасці працы і арганізацыйныя аспекты дзейнасці атраднага выхавальніка, логіку развіцця лагернай змены, тэхніку бяспекі і даўрачэбную дапамогу, формы арганізацыі вольнага часу дзяцей, падрыхтоўку і правядзенне агульналагерных мерапрыемстваў. За лагерную змену педатрадаўцы паспяхова правялі больш за 20 мерапрыемстваў. Асабліва дзецям спадабаліся конкурсы «Прэзентацыя атрада», «Фестываль мастацтваў», «Карнавал», «Голас. Дзеці. Зубраня», «Інсцэніраванне казкі» і іншыя.

З аздараўленчым дзіцячым лагерам «Зялёны бор» Мінскага культурна-спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна» факультэт сацыяльна-педагагічных тэхналогій БДПУ плённа супрацоўнічае ўжо цягам дзесяці гадоў. Ва ўдзельнікаў атрада «Ніка» ёсць магчымасць падчас канікул уладкавацца сюды на пасады педагога-арганізатара, сацыяльнага педагога, педагога дадатковай адукацыі і выхавальніка. Гэта дае шанц не толькі для працаўладкавання, але і для прафесійнай самарэалізацыі. У гэтым сэнсе ўдзел у складзе атрада — каласальны педагагічны вопыт. Не дзіва, што па выніках працы «Нікі» прафесіянальная падрыхтоўка і практычная педагагічная дзейнасць большасці студэнтаў, што ўваходзілі ў атрад, ацэнена на «9» і «10».

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Парады бывалых

ПЕРШАКУРСНІК... ЯК МНОГА Ў ГЭТЫМ СЛОВЕ!

або Выпрабаванне на трываласць

Самы адказны этап у жыцці абітурыента — цэнтралізаванае тэсціраванне — ужо даўно пройдзены, але, чым бліжэй верасень, тым часцей будучага студэнта пачынаюць наведваць думкі пра вучобу. Як гэта будзе? Чаго чакаць ад новай прыступкі ў дарослае жыццё? Знайсці адказы на пытанні дапамогуць тыя, хто ўжо меў магчымасць адчуць, што значыць быць першакурснікам.

Вольга ВАРАНЕЦ, II курс Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ:

— Першы курс для мяне прайшоў вельмі насычана, ярка і прадуктыўна! Я пазнаёмілася з вялікай колькасцю цікавых, мэтанакіраваных і амбіцыйных людзей, пры стасунках з якімі нельга было самой не стаць такой жа. Пачатак вучобы адкрыў для мяне шмат новых магчымасцяў і перспектыў для рэалізацыі сябе. Напрыклад, на базе нашага факультэта існуе адукацыйны клуб Business Intelligence Club, дзверы якога адчынены для студэнтаў і абітурыентаў ВНУ бясплатна. Мне пашанцавала: мае здольнасці заўважылі і ацанілі, і ўжо з сярэдзіны першага курса я стала кіраўніком гэтага цудоўнага праекта.

Трэба адзначыць, што першы курс — гэта не толькі адна вучоба, але і процьма розных мерапрыемстваў, конкурсаў, турзлётаў. Так што магу з упэўненасцю сказаць: першы курс — гэта крута!

Дар'я СЯНЬКОВА, II курс Інстытута журналістыкі БДУ:

— Калі ты не робіш урокі ў школе, настаўнікі будуць з усіх сіл намагацца паўплываць на цябе. Ва ўніверсітэце ты стараешся сам, таму што гэта ў тваіх жа інтарэсах: пасля чарговай сесіі на курсе можа застацца хто-небудзь больш руплівы. Першы курс — гэта магчымасць самому складаць расклад свайго дня, размяркоўваць свае рэсурсы. Твае бацькі па-ранейшаму падтрымліваюць цябе, але пры гэтым ты ўжо жывеш сваім жыццём. Гэта выдатная трэніровачная пляцоўка перад дарослым жыццём.

Найбольш запомніліся дзве мае паспяхова здадзеныя сесіі. Але не складанасцямі ў здачы экзаменаў, а атмасферай сярод аднакурснікаў. Сесія — гэта час усеагульнага яднання студэнтаў.

Вольга ТРАФІМЕНКАВА, II курс інжынерна-эканамічнага факультэта БДУІР:

— Раней заўсёды думалася, што вучоба ў вышэйшай навучальнай установе і школе будзе адрозніваца не нашмат. Але атрымалася ўсё не зусім так. Адарваўшыся ад бацькоўскага гнязда, можна і прагульваць заняткі. Але ці трэба, калі гэта можа адгукнуцца поўным неразуменнем на наступнай лекцыі?

Напэўна, самая важная і запамінальная падзея ў жыцці яшчэ зусім «зялёных» першакурснікаў — пасвячэнне ў студэнты. І хаця кажуць, што афіцыйна называцца студэнтам першакурснік можа толькі пасля першай сесіі, адабраць у мяне званне «Студэнт БДУІР» я не дазволіла б нікому і да яе!

Святлана ШАРАМЕТ, II курс факультэта англійскай мовы МДЛУ:

— Першы курс для мяне — гэта сіонім слова «перамены»: новыя знаёмствы, новыя выкладчыкі. Мне запомніліся вячоркі ў кавярні з аднагрупнікамі і іншыя прыемныя дробязі, напрыклад, выбар падарункаў на дзень нараджэння кожнаму чалавеку ў нашай групе.

Складана было толькі спачатку. Калі ты змяніў свой школьны калектыў на студэнцкі, ты нібы пераехаў з маленькага горада ў мегаполіс. Гэта значыць, трэба быць максімальна гнуткім і камунікабельным чалавекам.

Год вучобы даў мне моцны штуршок у вывучэнні англійскай мовы. Акрамя гэтага, універсітэт — выдатная магчымасць абзавесціся не толькі карыснымі знаёмствамі, але і знайсці нешта сапраўднае: сяброўства ці нават каханне.

Аляксандра КАЙРЫС, II курс факультэта эканомікі і кіравання гандлем БДЭУ:

— Для мяне першы курс быў сапраўдным выпрабаваннем на трываласць. Гэта той час, калі ўваходзіш у зусім нязвыклы для цябе рытм жыцця, усё ўжо залежыць толькі ад цябе, ад тваёй стараннасці, часам гнуткасці і, вядома ж, увагі і працавітасці. Так што магу сказаць, што не васямнаццаць гадоў робяць цябе дарослым і адказным, а пройдзены такі этап, як першы курс.

Найбольш запомнілася першая сесія. Я і да гэтага часу здзіўляюся, як змагла яе пераадолець. Цікава было праверыць уласныя сілы і магчымасці.

...Першы курс — час, у якім найбольш гарманічна спалучаюцца юнацкія амбіцыі і шырокае кола магчымасцяў. Кожны дзень ва ўніверсітэце — гэта шанц праявіць сябе, раскрыць свае таленты і ўдасканаліць веды. Вельмі важна не баяцца, не спадзявацца на тое, што хто-небудзь заўважыць цябе і прапануе «залатыя горы». Вучоба ў вышэйшай навучальнай установе — гэта пэўная ступень самастойнасці. Таму адказнасць за прафесійную будучыню трэба адразу браць на сябе. І калі ты ўпэўнены ў сваіх сілах і ведах, то зможаш пераадолець любыя перашкоды.

Марыя ДАРАШКЕВІЧ, студэнтка II курса Інстытута журналістыкі БДУ.

Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

Ведай нашых!

Абышоў на фінішы за пяць хвілін

Беларус Генадзь Караткевіч другі год запар выйграе фінал найпрэстыжнейшага конкурсу праграмавання кампаніі Google.

Міжнародны чэмпіянат па праграмаванні Google Code Jam праходзіць, пачынаючы з 2003 года. Штогод ён збірае больш за 20 тысяч удзельнікаў, аднак у фінал праходзяць толькі 26 найлепшых. Экс-гамяльчанін, а цяпер студэнт Санкт-Пецярбургскага нацыянальнага даследчага ўніверсітэта інфармацыйных тэхналогій, механікі і оптыкі, рашыў пяць задач з шасці, на што выдаткаваў 3 гадзіны 59 хвілін, набраўшы 155 ачкоў. Інтрыга захоўвалася да самага канца. Паводле папярэдніх звестак, беларус ішоў трэцім, а 29 балаў, якія прадвызначылі зыход барацьбы, хлопец набраў усяго за пяць хвілін да заканчэння спаборніцтваў.

Другое месца дасталася прадстаўніку Японіі Макота Саеджыма, трэцяе — выхадцу з ПАР Брусу Мэры. У фінале таксама ўдзельнічаў яшчэ адзін беларус — выпускнік БДУ Раман Удавічэнка, які ў выніковым заліку заняў 18-е месца.

У якасці прыза Генадзь Караткевіч атрымаў 15 тысяч долараў і права на ўдзел у фінале Google Code Jam у наступным годзе. Дзякуючы другой перамозе ўраджэнца Гомеля ў беларусаў ужо тры першыя месцы ў фінале Google Code Jam — больш, чым у прадстаўнікоў любой іншай краіны. У 2013 годзе ў конкурсе перамог выпускнік Белдзяржуніверсітэта Іван Мяцельскі.

Дарэчы, тыднем раней Генадзь Караткевіч стаў трохразовым пераможцам чэмпіянату па спартыўным праграмаванні «Яндекс. Алгарытм». У гэтым годзе на рахунку беларуса таксама перамогі ў Facebook Hacker Cup (другі раз запар) і ACM ICPC (у другі раз).

Генадзю Караткевічу прысвечаны асобны артыкул у усветнай інтэрнэт-энцыклапедыі. Як паведамляе англамоўная «Вікіпедыя», хлопчык аказаўся ў цэнтры ўсеагульнай увагі, калі быў заяўлены ў якасці ўдзельніка на міжнародную алімпіяду па інфарматыцы сярод школьнікаў (IOI) ва ўзросце 11 гадоў, што з'яўляецца сусветным рэкордам. Генадзь Караткевіч стаў самым юным абсалютным пераможцам алімпіяды і трымаў сваё лідарства на гэтым конкурсе з 2009 па 2011 год.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

ЯК ПРЫЕЗДЖЫЯ «ЗАВАЁЎВАЮЦЬ» СТАЛІЦУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Ганна ВАЛЫНЕЦ, прыехала з Вілейкі, таксама ў Мінску ўжо 8 гадоў:

— Мінск поўны цудоўных людзей, з якіх, на жаль, так мала зрабіліся маімі сябрамі. Гэта горад, дзе адчуваеш сябе вольна. Сталіца, на мой погляд, можа быць добрай школай для развіцця асобы і пашырэння гарызонтаў. Але для мяне яна не той горад, дзе я пражыву жыццё.

Аляксандр ХАЦКЕВІЧ, прыехаў з Віцебска, «стаж» жыцця ў сталіцы — 4 гады:

— Я адаптаваўся ў Мінску можа менш чым за месяц. На другім курсе пачаў падпрацоўваць і цяпер ведаю горад не горш (а можа, і лепш) за тых, хто жыве тут з нараджэння.

Ганна НЯКРАСАВА, прыехала з Гомеля, у Мінску ўсяго год:

— Мая адаптацыя доўжылася нядоўга: з моманту, калі я засталася на пероне адна з вачыма, поўнымі слёз, і да таго, як упершыню... пасварылася з кімсьці ў метро. Напачатку мне было складана разабрацца з транспартам, я шмат разоў выходзіла не на сваёй станцыі. А так, у прынцыпе, у Мінску я адчуваю сябе лёгка і нязмушана.

Супрацоўнік псіхалагічнай службы БДУ Юлія ЯЦКЕВІЧ звяртае ўвагу на матывацыю: яна розная ў тых, хто жыве ў сталіцы з нараджэння, і тых, хто сюды прыехаў. Для апошніх паступленне ва ўніверсітэт з'яўляецца пераломным момантам у жыцці, калі дзіця за кароткі тэрмін пераўтвараецца ў дарослага чалавека.

Галоўны, надзвычай важны момант — пачатак самастойнага жыцця без бацькоў. Пакуль маладыя людзі знаходзяцца ў бацькоўскім доме, яны нават не задумваюцца пра такія элементарные рэчы, як прыгатаванне ежы ці аплата камунальных паслуг. А між тым, калі студэнт не будзе займацца гэтым сам, за яго тое ніхто не зробіць. Здавалася б, дробязі, але яны вучаць адказнасці. Многія мінчане сутыкаюцца з бытавымі абавязкамі толькі пасля заканчэння вучобы, а то і пазней.

З'язджаюць у іншыя гарады і сябры студэнтаў з розных мясцін. Гэта падштурхоўвае да знаёмстваў. У новым асяродку (а для моладзі, якая прыехала, ім з'яўляецца не толькі ўніверсітэт, але і ўвесь горад) даводзіцца наладжваць новыя кантакты прасцей. Кожны дзень студэнт, для якога Мінск — чужы, павінен пытаць пра дарогу ў незнаёмцаў, прасіць парады ў выпадковых людзей наконт цырульні ці крамаў.

Не трэба абмінаць і той факт, што ў сталіцу, як правіла, прыязджаюць найлепшыя выпускнікі. І калі дома яны ўжо нечага дасягнулі, дык тут пра гэта ніхто не ведае. Таму студэнты наноў мусяць працаваць над сваім іміджам: вучыцца на «выдатна», займацца навуковай дзейнасцю або творчасцю. Дарэчы, абсалютная большасць актывістаў у арганізацыях студэнцкага самакіравання — хлопцы і дзяўчаты, якія не з'яўляюцца карэннымі мінчанамі.

Стаўленне да працы таксама адрозніваецца. Невялікае апытанне студэнтаў БДУ дае наступныя вынікі: 7 з 10 студэнтаў, якія прыехалі, падпрацоўваюць, з 10 студэнтаў-мінчан маюць падпрацоўку толькі 4. Першыя пачынаюць шукаць дадатковыя крыніцы даходу ўжо на першым-другім курсе, у той час як другія адкладваюць гэта да трэцяга-чацвёртага курса. Акрамя гэтага, апытанне паказала, што студэнты, перад тым, як ехаць вучыцца ў Мінск, грунтоўна падыходзяць да выбару будучай прафесіі: амаль усе хлопцы і дзяўчаты плануюць пасля выпуску працаваць па спецыяльнасці. Мінчане ж загадваць не спяшаюцца і не выключаюць магчымасці займацца тым, што не звязана з іх навучаннем ва ўніверсітэце.

Ганна КУРАК, студэнтка III курса Інстытута журналістыкі БДУ.

Незвычайны праект

КУЛЬТУРА ПА АБМЕНЕ

Студэнты і выпускнікі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, а таксама Турынскага і Міланскага дзяржаўных універсітэтаў працавалі сёлета разам у міжнародным лагеры ў Калінкавіцкім раёне.

Праект рэалізоўваўся на падставе дагавора, заключанага БДПІ з Італьянскай гуманітарнай асацыяцыяй PUER, якая ініцыявала арганізацыю лагера ў канікулярны перыяд для беларускіх дзяцей, што пражываюць на пацярпелых пасля чарнобыльскай катастрофы тэрыторыях Калінкавіцкага раёна. Дапамогу ім, як і аздараўленне ў Італіі, група валанцёраў вяла шмат гадоў. Аднак не ўсе дзеці маглі выехаць за межы краіны на аздараўленне. Так нарадзілася ідэя арганізацыі цікавага адпачынку па месцы іх жыхарства. Італьянцы цягам года рыхтаваліся да працы з дзецьмі ў культурным крос-лагеры, наведваючы лекцыі па псіхалогіі, сацыялогіі, медыцыне. Замежныя валанцёры знаёміліся з асаблівасцямі беларускай культуры, менталітэту, характару. Беларускую групу студэнтаў склалі ўдзельнікі псіхалагічнага тэатра пластычнай імправізацыі «АКМЕ», якія на базе лабараторыі сацыяльна-псіхалагічных праблем сучаснай беларускай моладзі пры кафедры сацыяльнай псіхалогіі БДПІ падрыхтавалі ўласную праграму працы ў лагеры. Яна мела на ўвазе стварэнне крэатыўных лабараторый тэатральнага, мастацкага, дэкаратыўна-прыкладнога, песеннага, танцавальнага напрамкаў.

Аздараўленчы лагер размяшчаўся на базе Юровіцкай сярэдняй школы. Валанцёры штодня выязджалі, каб сустрэцца і арганізаваць работу з дзецьмі з Мазырскага сацыяльна-педагагічнага цэнтра, а таксама ў вёсках Малыя Аўцюкі, Прудок, Хоўна, Агароднікі. У прытулку сацыяльна-педагагічнага цэнтра ў той час знаходзілася 15 дзяцей ва ўзросце ад чатырох да сямнаццаці гадоў. Штодня беларускія і італьянскія валанцёры праводзілі з дзятвой розныя развіваючыя мерапрыемствы: гульні, заняткі па лепцы, маляванню, пляценню. Нягледзячы на моўны бар'ер, адкрытасць і добразычлівасць італьянцаў дазволіла ім знайсці агульную мову з дзецьмі.

У склад важатых міжнароднага лагера ўваходзілі дзевяць італьянскіх юнакоў і дзяўчат, дзве дзяўчыны з Паўднёвага Судана, адна калумбійка. Усе — студэнты і выпускнікі італьянскіх універсітэтаў. Апроч таго, у лагеры працавалі і пяць беларусак — студэнтак і выпускніц Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. Для Італьянскай гуманітарнай асацыяцыі гэта быў першы вопыт па арганізацыі такога лагера, тым не менш і італьянскі, і беларускі бакі ацанілі яго як вельмі цікавы і выключна станоўчы.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения	- капитальное строение, инв. № 452/С-6012 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака (здание молочного завода), наименование – здание молочного завода), площадью 580,0 кв.м, расположенное по адресу: г.п. Зельва, ул. Шаповалова, 31. - капитальное строение, инв. № 452/С-6013 (назначение – здание административно-хозяйственное (здание конторы), наименование – здание конторы), площадью 185,1 кв.м, расположенное по адресу: г.п. Зельва, ул. Шаповалова, 31
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422655100001001442 (назначение – земельный участок для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции), площадью 1,1700 га, расположенном по адресу: г.п. Зельва, ул. Шаповалова, 31. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи напряжением до 1000 вольт на часть земельного участка, площадью 0,0057 га
Начальная цена продажи	1 778 000 000 (один миллиард семьсот семьдесят восемь миллионов) белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	177 800 000 (сто семьдесят семь миллионов восемьсот тысяч) белорусских рублей
Продавец	Волковысское ОАО «Беллакт», 231900, г. Волковыск, ул. Октябрьская, 133. Тел. 8-01512-7-50-85, факс 7-50-26
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739 УНП 500833225
Аукцион состоится 01 октября 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209	
84	1739	Пашкевич	Светлана	Викторовна	Новополоцк	Кепка красная 31000-30 Фуфайка красная 22150-30 (М) мужская
85	2156	Федосов	Генадий	Сергеевич	Речица	Кепка красная 31000-30 Фуфайка красная 22150-30 (М) мужская
86	1450	Попович	Татьяна	Владимировна	Береза	Кепка красная 31000-30 Фуфайка красная 22150-30 (М) мужская
87	3744	Минина	Людмила	Викторовна	Могилев	Кепка красная 31000-30 Фуфайка красная 22150-30 (М) мужская
88	3347	Болошенко	Тамара	Михайловна	Могилев	Кепка красная 31000-30 Фуфайка красная 22150-30 (М) мужская
89	3443	Алекстна	Анна	Петровна	Полоцк	Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22150-20 (М) мужская
90	210	Юрасов	Дмитрий	Викторович	Речица	Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22150-20 (М) мужская
91	3096	Лашкевич	Любовь	Алексеевна	Гомель	Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22150-20 (М) мужская
92	560	Мицкевич	Наталья	Ильинична	Солигорск	Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22150-20 (М) мужская
93	3738	Герасимчик	Александр	Сергеевич	Барановичи	Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22150-20 (М) мужская
94	4461	Осинина	Елена	Владимировна	Брест	Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22150-20 (М) мужская
95	1835	Козел	Наталья	Николаевна	Барановичи	Кепка черная 31001-26 Фуфайка черная 22160-26 (L) женская
96	208	Чигилейчик	Нина	Романовна	Минск	Кепка черная 31001-26 Фуфайка черная 22160-26 (L) женская
97	3637	Мороз	Александр	Константинович	Мстиславль	Кепка черная 31001-26 Фуфайка черная 22160-26 (L) женская
98	3184	Шукелойть	Яков	Юрьевич	Молодечно	Кепка черная 31001-26 Фуфайка черная 22160-26 (L) женская
99	4356	Денисевич	Сергей	Александрович	Гродно	Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22160-20 (М) женская
100	2218	Таразевич	Людмила	Ивановна	Крупки	Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22160-20 (М) женская

Свидетелями розыгрыша стали все посетители торгового центра, где и проходил случайный выбор победителей. Еще раз поздравляем всех победителей, которые стали счастливыми обладателями нарядов для на100ящего отдыха.
Продолжайте радовать себя и своих близких ювелирными украшениями от магазинов « Золотая мечта», «Царское Золото» и «Zoloto.by», следите за нашими акциями и Ваши мечты обязательно сбудутся!

Сведения об организаторе:

1. Частное торговое унитарное предприятие «Бигпрайм».

2. Юридический адрес: г. Молодечно, ул. Притыцкого, д. 12, комн. 26. Почтовый адрес: 220004, г. Минск, ул. М. Танка, д. 4.

3. Наименование рекламной игры – «100 нарядов для На100ящего отдыха».

4. Срок начала и окончания рекламной игры: начало – 10 июля 2015 г., окончание – 14 сентября 2015 г.

5. Территория, место и срок проведения рекламной игры. Территория проведения рекламной игры – ювелирные магазины «Царское золото», «Золотая мечта» и «Zoloto.by» на территории Республики Беларусь.

6. Свидетельство №2590 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 2 июля 2015 г., выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

7. Количество участников рекламной игры – 4 837 человек.

8. Призовой фонд был разыгран полностью.

9. Победители указаны в таблице №1, общим количеством 100 человек.

10. Телефон для справок: +375(17)203-00-85.
Сайт: http://carskoe.by/, http://gold-dream.by/

11. ЧТУП «Бигпрайм». УНП691511104, зарегистрированное Молодечненским районным исполнительным комитетом 26 июня 2013 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей. Специальное решение (лицензия) выдано на основании решения от 9 августа 2013 г. №267 сроком на десять лет и зарегистрировано в реестре специальных разрешений (лицензий) Министерства финансов Республики Беларусь № 21-01135. Действительна по 8 августа 2023 г.

Адам МАЛЬДЗІС: «БЕЛАРУСКАЯ МАЕ ДАЎНІЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як ахарактарызаваць гэтага няўрымслівага, шматграннага, шматаблічнага чалавека? Хто ён, Адам МАЛЬДЗІС?

Журналіст? Безумоўна. Пра гэта нават запісана ва ўніверсітэцкім дыпломе. Дый пачынаў свой працоўны шлях з раённай газеты, у якой і добрасумленна адслужыў тры гады. Пасля шмат гадоў рэдагаваў штомесячны бюлетэнь «Кантакты і дыялогі», серыйны зборнік «Вяртанне». Супрацоўнік вядомага тыднёвіка «Голас Радзімы», аглядальнік газеты «СБ. Беларусь сегодня».

Пісьменнік? Несумненна. Першую яго аповесць «Восень пасярод вясны» высока ацаніў Уладзімір Караткевіч і вельмі раіў працягваць творчую працу. Аднак другую аповесць з-за востраго дэфіцыту часу ўсё ніяк не ўдаецца скончыць...

Краязнаўца. Любоў да роднага краю, да ўчарашняга і сённяшняга дня Беларусі жыве ў ім з юнацкіх гадоў. Сваёй малой радзіме ён прысвяціў кнігу «Астравеччына, край дарагі...», а ў шматлікіх даследаваннях раскрыў многія таямніцы нашай нацыянальнай культурнай спадчыны.

Энцыклапедыст. Гэтага звання ён заслугоўвае, як ніхто іншы. Глыбокія, рознабаковыя веды літаратуразнаўцы, гісторыка, краязнаўцы, географа, этнографа ў спалучэнні з асабістымі якасцямі — жывым, дапытлівым розумам, учэпістай памяццю, неспатольнай цікаўнасцю — робяць яго асобу ўніверсальнай і ўнікальнай.

Грамадскі дзеяч: Адам Мальдзіс быў шматгадовым кіраўніком Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, ён старшыня камісіі «Вяртанне» пры Беларускім фондзе культуры, член дзвюх спецыяльных міжведамасных камісій пры Савеце Міністраў рэспублікі.

Важкім набыткам яго навуковай творчай працы сталі амаль два дзясяткі ёмістых кніг. Найбольш удалай сярод іх Адам Восіпавіч лічыць «Жыцце і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча». Тут яму ўдалося спалучыць у адно цэлае мемуары, эсэ і літаратуразнаўства. Самай дарагой для аўтара кнігай з'яўляецца «Падарожжа ў XIX стагоддзе». Дарагой, таму што гэта была першая сур'ёзная спроба расказаць пра нашу культурную спадчыну, намаляваць яскравыя партрэты пісьменнікаў, кампазітараў, падарожнікаў, дзеячаў вызваленчага руху. І, вядома ж, пісалася ўсё гэта з вялікім жаданнем, ад душы і для душы.

Прыемна адзначыць, што актыўная і плённая праца Адама Мальдзіса дастойна адзначана высокімі ўзнагародамі. Ён лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, уганараваны медалём Францыска Скарыны.

ДЗЕ АДКАПАЦЬ РУКАПІСЫ

— Адам Восіпавіч, ці ўдаецца вам пры ўсёй вашай фантастычнай загружанасці сачыць за навінкамі беларускай літаратуры?

— Магу сказаць, што ў курсе многіх літаратурных навінак. І ў адрозненне ад тых, хто сцвярджае, нібыта ў нас няма нічога значнага, цікавага, лічу, што ёсць і цікавае, і значнае. І ўзровень нашай літаратуры дастаткова высокі. Трэба толькі аддзяліць (добра, каб гэта рабілася яшчэ на стадыі падрыхтоўкі да друку) зерне ад мякіны. Лічу, што і ў «Полымі», і ў «Маладосці» ў кожным нумары ёсць дзве-тры-чатыры публікацыі, вартыя сур'ёзнай увагі, самай высокай ацэнкі. У сучаснай беларускай літаратуры, нягледзячы на скаргі, ёсць нямала цікавага, значнага. У той жа час павялічваецца колькасць графаманаў. І ўвогуле колькасць слабых кніжак цяпер, калі можна выдаваць за свае грошы ці за грошы сябра, катастрафічна нарастае.

Карацей кажучы, работа літаратара становіцца больш масавай і менш падкантрольнай. Усё-такі ў савецкі час дзяржава ставіла своеасаблівы фільтр (праўда, некалі у ім затрымліваліся і сапраўдныя таленты, як, скажам, Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, але гэта ўжо іншая справа). Тым не менш адначасова гэта быў надзейны фільтр для графаманаў. Як вядома, функцыі такога фільтра выконвалі мастацкія рэдактары. Дзе цяпер такія рэдактары? У прыватных выдавецтвах кнігі часам выдаюцца наогул без усялякай рэдактуры. Што прынёс, тое і друкуюць, абы аўтар плаціў грошы.

У наш час, калі усё большую ўладу над чалавекам бярэ камп'ютар, інтэрнэт, некаторыя скептыкі схільны думаць, што кніжка наогул адмірае. Але мне здаецца, што гэтага ніколі не будзе. Проста кніга стане больш дарагой, больш дасканалай у мастацкіх і паліграфічных адносінах. Затое і шанаваць яе будуць болей.

— Ці можа мастак заставацца свабодным, жывучы ў грамадстве? Ён павінен быць вольным, як птушка, быць творцам чыстага мастацтва? Якімі крытэрыямі трэба карыстацца пры вызначэнні такой тонкай, далікатнай матэрыі, як свабода творчасці?

— Якімі крытэрыямі? Найперш тымі пісанымі і няпісанымі маральнымі законамі, што ўсталяваліся ў грамадстве. І, вядома ж, запаведзямі і прынцыпамі хрысціянскай маралі. Калі для чалавека няма нічога святога, усё дазволена, то тады ўзнікае пытанне: а куды ж мы прыйдзем з такой мараллю?

Я неяк задумаўся, чаму Усявышні выгнаў Адама і Еву з раю. Што яны парушылі? А парушылі яны забарону не чапаць плод з дрэва пазнання, з дрэва дабра і зла. Інакш кажучы, перайшлі мяжу, за якой пачынаецца для чалавека небяспека. А мы што цяпер робім? Парушаем на кожным кроку. Асабліва гэта небяспечна для літаратара, бо тым самым ён разбурае не толькі сябе, але і чытача.

— Чаму гэта стала магчымым?

— Таму што літаратурная прафесія зрабілася занадта моднай. А гэта не мода павінна быць, а духоўная патрэба, душэўнае прызванне. Калі ты апантаны гэтым, не можаш не пісаць — тады пішы. А калі табе ўсё роўна, пісаць па-руску ці па-беларуску, гістарычны раман ці фэнтэзі, то лепш не бярыся за пяро, не садзіся за камп'ютар. Караткевічу, напрыклад, было не ўсё роўна. І Быкаў не выходзіў за рамкі сваёй тэматыкі, а калі і выходзіў, то гэта былі не лепшыя творы.

— Як вы лічыце, пісьменнік павінен задаваць пытанні ці даваць адказы? Літаратура — гэта лекі ці толькі тэрмометр?

— І тое, і другое. Добрая кніга, безумоўна, павінна памагаць чалавеку ў вырашэнні няпростых жыццёвых пытанняў, але не ў выглядзе назойлівых парад, гатовых адказаў, а падрыхтоўваць, падштурхоўваць яго, каб ён сам прыйшоў да пэўнага рашэння. Бо калі гэта будзе адкрытае павучанне — рабі так і не рабі гэтак, — чытачу стане сумна, і, хутчэй за ўсё, ён такую кніжку адкладзе ўбок. Ісціна павінна быць укладзена ў эмацыянальную, глыбока псіхалагічную абалонку. Толькі тое, што чалавека ўсхвалявала, што ён перажыў сэрцам, стане надзейным набыткам яго розуму.

— Як вядома, яшчэ ў XII стагоддзі мы мелі такі таленавіты твор, як «Жыціе Еўфрасінні Полацкай». Крыху пазней праславіўся сваімі бліскучымі казаннямі Кірыла Тураўскі. А выдатная публіцыстыка Францішка Скарыны? А геніяльная «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага? І многа іншых літаратурных твораў, якія былі вядомыя за межамі беларускіх зямель, можна яшчэ прыгадваць. Чаму ж у XIX стагоддзі нам давялося фактычна пачынаць усё як бы нанова? Чаму наша літаратура пачала развівацца з пэўным спазненнем у параўнанні з суседнімі краінамі?

— Пытанне і сапраўды няпростае. У развіцці культуры, літаратуры ў прыватнасці, вялікую ролю іграюць творчыя сувязі пакаленняў, пераемнасць традыцый. У нас жа гэтыя сувязі на доўгі час былі штучна перапынены. Прычыны вядомыя — паланізацыя, русіфікацыя. І пачынаць трэба было ўсё занава, хоць і не на голым месцы. Былі ўзоры, і дастаткова высокія. «Тарас на Парнасе», «Энеіда навыварат». Творы Дуніна-Марцінкевіча.

Але на дварэ стаяла ўжо XIX стагоддзе. Змяніўся час, іншымі сталі абставіны. І пачынаць на ўзроўні летапісаў ці ананімных твораў было б нонсенсам. Задача заключалася ў тым, каб шукаць новыя шляхі, новыя мастацкія сродкі. Раўняцца не толькі на здабыткі свайго мінулага, але і на сучасны ўзровень еўрапейскай літаратуры. Ніякае перайманне плёну не дало б. Адраджэнне трэба было весці на ўласнай глебе з улікам усіх нацыянальных асаблівасцяў. Таму мы крыху і затрымаліся.

— Вы шмат часу і творчых сіл аддалі даследаванню жыцця і творчасці аднаго з пачынальнікаў беларускай літаратуры — Францішка Багушэвіча. У друку паведамлялася, што ўнучка Багушэвіча ў 1941 годзе прынесла ў Беларускі музей у Вільні з паўкілаграма рукапісаў свайго дзеда. Дзе гэтыя рукапісы цяпер?

— Цяжка сказаць. Хутчэй за ўсё страчаны. Калі расфарміравалі віленскі музей, след іх згубіўся. Асобныя рукапісы ёсць у нашай акадэмічнай бібліятэцы, але ж гэта не паўкілаграма — некалькі старонак. А шкада, бо там, напэўна, былі рэчы, якія нідзе не друкаваліся.

— А што сталася з тымі 17 старонкамі багушэвічаўскага рукапісу, якія меў у сваім архіве былы рэдактар «Гродзенскай праўды» Андрэй Бураў? Таксама зніклі?

— На жаль, зніклі. Як знікла кніга «Скрыпачка беларуская», што была выдадзена ў Прусіі, але на мяжы канфіскавана расійскімі ўладамі. А дзе шукаць рукапісы «Дудкі беларускай», выдадзенай у Кракаве, «Смыка беларускага», выдадзенага ў Прусіі? Бясследна прапала таксама некалькі апавяданняў, якія ў нас нідзе не друкаваліся. Як бачыце, творчая спадчына Багушэвіча панесла страты непапраўныя.

— Але ж нейкія рукапісы вы адкапалі (у прамым сэнсе) на агародзе ў Кушлянах. Што гэта за рукапісы і як вы іх знайшлі?

— Гэта, хутчэй за ўсё, былі лісты Элізы Ажэшкі да Багушэвіча. Яны пэўны час актыўна перапісваліся. На жаль, ад лістоў засталіся адны шматкі. Мы аддавалі іх на рэстаўрацыю крыміналістам — нічога не змаглі прачытаць. Аднавілі толькі пару слоў, почырк нагадвае ажэшкаў.

А як знайшоў? Калі прыязджала ўнучка Багушэвіча, мы разам з ёю паехалі на радзіму яе дзеда. І там мясцовыя жыхары нечакана ўспомнілі, што нібыта на агародзе нешта закапана. Старшыня калгаса даў людзей, і мы даволі хутка знайшлі невялікі слоік. Закапаны ён быў неглыбока, ад маразоў трэснуў, і папера з гадамі сатлела. Такі вось немудрагелісты сюжэт.

— Затое куды больш мудрагелісты сюжэт, здаецца, закручваецца вакол імя Паўлюка Багрыма. Ужо не адзін год у асяродку навукоўцаў і краязнаўцаў-аматараў вядуцца гарачыя спрэчкі адносна аўтарства хрэстаматыйнага верша «Зайграй, зайграй, хлопча малы...» Калі не Багрым яго напісаў, то хто? Вы таксама былі ўцягнуты ў арбіту гэтых спрэчак. І да якой высновы прышлі?

— Апошнія факты і логіка сведчаць, што Паўлюк Багрым, хутчэй за ўсё, не быў аўтарам верша. Розумам я пагаджаюся з гэтым, а сэрцам прыняць цяжка. Разбураецца прыгожы міф аб тым, што мы мелі адзінага сялянскага паэта першай паловы XIX стагоддзя, што і ў нас, у беларусаў, акрамя паэтаў са шляхты, існаваў у той час свой патэнцыяльны Шаўчэнка.

Аднак факты, здабытыя рознымі даследчыкамі, неабвержна даказваюць: сям'я Багрымаў, аказваецца, жыла нябедна, а пасля, дзякуючы выгаднаму шлюбу Паўлюка, нават багата; бацька яго не быў «кіямі забіты», а самога хлопца не здавалі ў рэкруты на 25 гадоў; і, нарэшце, падчас паўстання ў юнага Паўлюка быў канфіскаваны зусім іншы верш — перапісаная «гутарка» Яна Баршчэўскага «Рабункі мужыкоў».

Дык хто ж тады напісаў «Зайграй, зайграй, хлопча малы...»? Ёсць версія, што яго аўтарам з'яўляецца былы навагрудскі адвакат, а пасля разгрому паўстання 1831 года — палітычны эмігрант Ігнацій Яцкоўскі. Менавіта ён упершыню надрукаваў гэты верш у ананімнай кнізе, а фактычна рамане «Аповесць майго часу, альбо Літоўскія прыгоды» — як на беларускай мове, так і ў перакладзе на польскую. Але чаму тады Яцкоўскі надрукаваў яго не пад сваім імем, а спаслаўся, нібыта твор належыць пяру «Пётрака з Крашына»? Не зусім зразумела, навошта спатрэбілася такая містыфікацыя? Да таго ж называецца Пётрак, а не Паўлюк.

Выказваюцца асцярожныя здагадкі і наконт Аляксандра Рыпінскага. Але калі меркаваць па яго баладзе «Нячысцік», то ён відавочна не дацягвае да таго ўзроўню паэтычнага майстэрства, з якім напісаны верш «Зайграй...». Яшчэ менш верагодны як аўтар Ян Баршчэўскі, затое больш — Юльян Ляскоўскі.

Таму на сённяшні дзень мы можам сказаць толькі тое, што аўтарам славутага верша з'яўляецца не Паўлюк Багрым. А вось хто — для высвятлення гэтага навукоўцам яшчэ трэба выканаць вялікую даследчыцкую работу.

— Дарэчы, пад сумненне трапіў не адзін Паўлюк Багрым. Існуюць розныя думкі і наконт аўтарства «Пінскай шляхты».

— Ведаеце, адкуль гэта пайшло? Упершыню, яшчэ ў 2000 годзе, такое сумненне выказала ў замежным друку прафесар Ніна Мячкоўская. Яе нечакана падтрымаў вядомы англійскі беларусіст Арнольд Макмілін, які публічна аб гэтым заявіў на Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 200-годдзю з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

Якія ж аргументы выстаўляюцца супраць аўтарства нашага Дудара? Маўляў, усе ягоныя тэксты напісаны лацінкаю, а «Пінская шляхта» — кірыліцай. Далей. На Піншчыне Дунін-Марцінкевіч ніколі не бываў, а на Століншчыне, якую пісьменнік колькі разоў наведваў, гавораць інакш. У творы — прыкметны ўплыў «Наталкі-Палтаўкі» Івана Катлярэўскага, а сувязі аўтара «Пінскай шляхты» з украінскай літаратурай нікім не ўстаноўлены. Нарэшце, як яшчэ адзін аргумент супраць, называецца той факт, што сам Дунін-Марцінкевіч сярод сваіх твораў у пісьме ў рэдакцыю пецярбургскага часопіса «Край» «Пінскую шляхту» не назваў.

А цяпер давайце разгледзім довады «за». «Пінская шляхта» была напісана пасля таго, як пісьменнік адпакутаваў больш за дзесяць месяцаў турэмнага зняволення, ягоны пераклад «Пана Тадэвуша» Адама Міцкевіча на беларускую мову лацінкаю быў канфіскаваны і знішчаны царскімі ўладамі, а сам ён вымушаны быў даць абяцанне, што надалей будзе карыстацца толькі кірыліцай. Што і зрабіў у сваім сатырычна-камедыйным фарс-вадэвілі.

Сцвярджаюць далей, што Дунін-Марцінкевіч не ведаў пінскіх гаворак. Але ж «Пінская шляхта» (звяртаю на гэта асаблівую ўвагу) напісана не на натуральнай гаворцы, а на штучнай, стылізаванай, прыдуманай мове. На той самай, на якой выдавалася і «Мужыцкая праўда».

І, бадай, самы істотны аргумент «за»: беларускі Дудар быў не толькі добра дасведчаны ў юрыспрудэнцыі тэарэтычна, але і асабіста прайшоў праз такое следчае і судовае кручкатворства, што яркіх сатырычных дэталяў хапіла б не на адну «Пінскую шляхту».

Ёсць і літаратуразнаўчыя довады. У свой час мне пашчасціла знайсці ў Варшаве сярод папер Аляксандра Ельскага рукапіс паэмы Дуніна-Марцінкевіча «З-пад Іслачы, альбо Лякарства на сон». Дык вось, у гэтай паэме знаходзім радкі, якія прама пераклікаюцца з «Пінскай шляхтай». Ды і ў самім «паляшуцкім» арыгінале можна выявіць відавочныя сляды аўтарскага ўмяшання. А тое, што гэты арыгінал напісаны менавіта рукою Дуніна-Марцінкевіча, не так даўно пацвердзіла і графічная экспертыза.

Такім чынам, калі падыходзіць да праблемы комплексна, з лікам усёй сукупнасці фактаў і фактараў, то ўслед за нашым найаўтарытэтнейшым вучоным Генадзем Кісялёвым я таксама магу сказаць: для навуковых высноў, нібыта Дунін-Марцінкевіч не з'яўляецца аўтарам «Пінскай шляхты», няма дастатковых падстаў.

ПРАРОЦТВЫ ГЕНІЯ

— Праўда жыцця і праўда літаратуры — гэта адно і тое ж ці ўсё ж такі гэтыя паняцці розныя?

— Розныя. Неяк мы з Караткевічам паехалі на маю Астравеччыну і пайшлі на тое месца, дзе стаяў крыж Аніліна паблізу былога маёнтка. У даўнейшыя часы сюды, у гэты маёнтак, нібыта прыязджалі і Калініоўскі, і Сыракомля, і іншыя вядомыя людзі. Калі я расказаў легенду пра крыж, Караткевіч нечакана прапанаваў: «Ведаеш што, стары? Давай мы напішам на гэты сюжэт творы — ты свой, а я свой. Паглядзім, што з гэтага выйдзе».

Я адразу пачаў аднеквацца, спасылаючыся, што я не пісьменнік, а літаратуразнаўца.

«Ну і што? — настойваў на сваім Караткевіч. — На розыгрышы ў цябе ж хапае фантазіі. Вось і тут прыдумай сюжэт, разыграй герояў — і сціло ў рукі. Пішы!»

Так нарадзілася мая першая аповесць «Восень пасярод вясны».

ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ ТРАДЫЦЫІ»

Я да чаго гэта расказваю? Часам у жыцці такога і не было, а ў літаратуры можна змадэляваць. Калі ўзяць тую ж маю аповесць, то, хутчэй за ўсё, у рэальнасці такога не было, каб у адзін і той жа час у адным і тым жа месцы апынуліся разам і Каліноўскі, і Сыракомля, і Гелена Кіркурава, і спраўнік Ашмянскага павета, і іншыя дзеючыя асобы. Гісторык мяне тут, як той казаў, паклаў бы на лапаткі, з лёгкасцю даказаўшы, што такога не было. Не было, але магло быць! Таму што не супярэчыла духу таго часу. Я мысліў лагічнымі катэгорыямі, не выходзячы за межы магчымага, за межы характару гістарычных асоб. Вось у гэтым і заключаецца розніца паміж праўдай рэальнай і праўдай мастацкай. Вымысел мастаку патрэбен для таго, каб больш ярка, глыбока, уражліва перадаць ідэю, галоўную думку твора, аднак гэты вымысел не павінен парушаць натуральнасць, логіку падзей і пачуццяў.

— 2010 год быў годам Уладзіміра Караткевіча. Мы ўпершыню так шырока і годна адсвяткавалі юбілей нашага літаратурнага класіка ці, як усё часцей і часцей называюць Уладзіміра Сямёнавіча ў друку, нашага нацыянальнага генія. Як вы лічыце, вызначэнне «геній» сапраўды адпавядае маштабу і сіле таленту Караткевіча, ці тут ёсць пэўны налёт юбілейнасці?

— Не, не, юбілей тут ні пры чым. «Геній» цалкам адпавядае маштабу яго таленту, глыбіні яго думак і неверагодным прароцтвам. Творчая спадчына Уладзіміра Караткевіча надзвычай багатая і шматгранная. Паэзія, проза, драматургія, публіцыстыка — усё было пад сілу гэтаму чараўніку пяра. Мне здаецца, няма жанра, у якім бы ён не выпрабаваў сябе. І не проста выпрабаваў, а паказаў бліскучыя ўзоры дасканаласці.

Справа яшчэ і ў тым, што Караткевіч апярэдзіў сваю эпоху. Прадчуванне будучыні і радавала яго, і палохала. Радавала, бо гэтая будучыня бачылася яму светлай і прыўкраснай. А засмучала, бо разумеў, што мы да такой будучыні яшчэ не падрыхтаваны. Думаем і дзейнічаем, як тутэйшыя. І таму як мастак, як грамадзянін многае рабіў для таго, каб падрыхтаваць нас, беларусаў, да таго шчаслівага моманту, калі нам нечакана падароць свабоду і незалежнасць, а мы асабліва не будзем ведаць, што рабіць з гэтым багаццем. Усёй сваёй творчасцю ён імкнуўся абудзіць нацыянальную самасвядомасць, паказваючы нашы багатыя традыцыі, нашу слаўную гістарычную мінуўшчыну.

— На адной з прэс-канферэнцый, прысвечаных памяці Уладзіміра Караткевіча, раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» вы назвалі сваім любімым творам. Чаму?

— Таму што лічу гэты твор найбольш спелым у мастацкіх адносінах. Ва ўсіх іншых яго творах галоўныя героі — гэта той жа Караткевіч з яго менталітэтам, з яго пачуццямі і думкамі. Яго лёгка пазнаць і ў рамантычна захопленым Алесе Загорскім з рамана «Каласы пад сярпом тваім», і ў няўрымслівым завадатары сялянскага паўстання Рамане Ракутовічу з аповесці «Сівая легенда», і ў дапытлівым вучоным-фалькларысце Андрэе Беларэцкім з «Дзікага палявання...», і ў маладым таленавітым гісторыку Антоне Касмічу з «Чорнага замка Альшанскага».

А вось у рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» няма і следу аўтабіяграфічнасці. Тут абсалютна прыдуманыя героі. Ступень мастацкай абстракцыі найвышэйшая. Ды і па сваёй структуры твор, на маю думку, самы завершаны.

— У сваёй кароткай біяграфіі «Дарога, якую прайшоў» Уладзімір Караткевіч піша: «... здаў у «Полымя» свой новы раман «Каласы пад сярпом тваім». Здаў першы том. Другі не выпускаю з рук, дапрацоўваю». Гэта размова ідзе пра другую кнігу, якая надрукавана, ці маецца на ўвазе той самы працяг рамана, які так і не пабачыў свету?

— Тут хутчэй за ўсё размова ідзе пра другую, апублікаваную, кнігу. А працяг рамана, відаць, быў. Бо Валодзя так не перажываў бы, калі яго кватэру абакралі, пакуль ён адпачываў у Крыме. Жонка ўсё бедавала наконт нейкіх сярэбраных лыжак, яшчэ нечага, а ён ажно злаваўся: «Што там лыжкі! Яны ведалі, што красці. Білі пад самы дых...» Па ўсім відаць, перажываў за рукапіс трэцяй і чацвёртай кніг.

— А прама ён ні разу не гаварыў, што ў яго ляжыць гатовы працяг?

— Прама не гаварыў. Ён, відаць, думаў, што мы і так пра ўсё здагадваемся. Мы ж увесь час яго «пілавалі»: чаму не працягваеш, чаму не заканчваеш раман? А ён толькі адмахваўся: «Думаеце, мне лёгка? Гэта ж трэба будзе адправіць людзей у ссылку, на шыбеніцу, а яны ж — мае дзеці». Справа ў тым, што ў надрукаваных кнігах паўстання яшчэ няма. А Караткевіча найбольш палохала менавіта паўстанне. Ён не быў рэвалюцыянерам, які б клікаў на барыкады. Ён, хутчэй, выступаў за эвалюцыйнае развіццё падзей. Лічыў, што народ павінен спакойна, мірна рабіць сваю справу.

А працяг быў напісаны, быў. Інакш ён не даваў бы Дубянецкаму, тагачаснаму дырэктару выдавецтва «Мастацкая літаратура», абяцанне, што «хутка мы зробім з вамі добрую справу».

— Адам Восіпавіч, вы былі блізкім сябрам Караткевіча. Раскажыце, калі ласка, якім ён быў у жыцці — у адносінах з сябрамі, з калегамі, сямейнікамі. Ходзяць розныя міфы: што ён нібыта мог за некалькі начэй напісаць цэлую аповесць; што характар меў няўрымслівы, імпульсіўны, гарачы; што мог надоўга выключыцца з творчай работы па прычыне вядомай слабасці...

— Ну, вядома ж, перабольшванне наконт начной актыўнасці. Ён столькі ніколі не пісаў. Але пісаў сапраўды хутка і, як правіла, начыста, бо спачатку ўсё да дэталяў прадумваў у галаве, а тады ўжо браўся за ручку. Чарнавікоў у яго не было.

Праўда і тое, што Караткевіч быў чалавек імпульсіўны. Але вельмі камунікабельны. Ён мог лёгка загаварыць з селянінам на вуліцы, з кандуктарам у трамваі, з архіепіскапам Антоніем, які жыў па суседстве. Вельмі проста і натуральна ўваходзіў у кантакт з самымі рознымі людзьмі. Што тычыцца «слабасці», то яна ў Валодзі была не большай і не меншай, чым у многіх нашых творцаў.

— А як Уладзімір Сямёнавіч успрымаў крытыку ў друку?

— Па-рознаму. Калі выйшаў фільм «Дзікае паляванне караля Стаха», я апублікаваў у «ЛіМе» рэцэнзію пад назвай «Яшчэ адзін добры сярэдні». Прыходжу да Валодзі і кажу: «Ты цяпер пачнеш мяне дубасіць ці пасля?» — «З-за чаго?» — «З-за рэцэнзіі». — «Ну чаму? Усё правільна. Я таксама лічу, што фільм атрымаўся сярэдні».

— А што вызначыла ваш выбар прафесіі? Напэўна ж, бацькі хацелі, каб вы засталіся пры іх, узялі гаспадарку ў свае рукі?

— Можа, і хацелі, але мне пра гэта ніколі прама не гаварылі. А свой выбар я зрабіў сам. У школе я шмат пісаў, друкаваўся ў розных газетах. Найчасцей у «Піянеры Беларусі». Першы вершык апублікаваў у раённай газеце яшчэ ў сёмым класе. Актыўна ўдзельнічаў у рабоце маладзечанскага, «ермаловіцкага» літаб'яднання. Але, як бачыце, паэтам не стаў. А вось журналістыка мне падабалася. Таму і паступіў на аддзяленне журналістыкі БДУ. Аднак журналістам я таксама не стаў. Адпрацаваўшы тры гады ў раёнцы, паступіў у аспірантуру і сур'ёзна заняўся кандыдацкай дысертацыяй. Смак даследчыцкай работы я адчуў яшчэ студэнтам. А крыху пазней канчаткова пераканаўся, што маё сапраўднае прызванне — навука. Чым і займаюся апошнія пяцьдзясят гадоў.

— Ведаю, што вы амаль тры дзесяцігоддзі працавалі ў Інстытуце літаратуры акадэміі навук. А пасля — нечакана для многіх — сышлі з інстытута і ўзначалілі Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф.Скарыны. Як і чаму гэта адбылося?

— Цэнтр быў створаны па рашэнні ЦК КПБ у рамках мерапрыемстваў, прысвечаных юбілею нашага славутага першадрукара. Спачатку цэнтр існаваў пры Інстытуце літаратуры, а пасля прыйшлі да высновы, што гэта павінна быць установа самастойная. З функцыямі колішняга Інбелкульта.

Узначаліць Скарынаўскі цэнтр даручылі мне. Напэўна таму, што я, па-першае, у нейкай меры займаўся даследаваннем аналагічнай праблематыкі і, па-другое, быў прэзідэнтам Міжнародна-асветніцкага таварыства імя Ф.Скарыны, якое аб'ядноўвала вучоных, пісьменнікаў, журналістаў, грамадскіх дзеячаў з 23 краін свету. Гэта таварыства было створана ў 1988 годзе, і я быў яго прэзідэнтам з самага пачатку. Цэнтр і таварыства ўзаемадзейнічалі, і мне было зручна кіраваць і тым, і другім.

Фота Наталлі АСМОЛы.

Калі прэтэнзіі былі абгрунтаваныя, слушныя і пераконвалі яго, то ён такую крытыку прымаў. А калі нагародзяць абы-чаго, то тут яго чэрці бралі. Ведаеце, пра Караткевіча і як чалавека, і як мастака можна расказваць бясконца. Падсумоўваючы, хачу зазначыць адно: беларуская літаратура ў яго асобе дасягнула еўрапейскага ўзроўню, і цяпер мы павінны, абавязаны вытрымліваць гэты ўзровень.

ШЧАСЦЕ ЯК ПРАЦЭС

— Адам Восіпавіч, адкуль вы родам? Хто былі вашы бацькі? Якім было ваша дзяцінства, школьныя гады?

— Нарадзіўся я на Астравеччыне, у вёсцы Расолы. Бацькі мае — звычайныя сяляне. Праўда, можа, крыху і не зусім звычайныя, бо бацькавы продкі былі літоўцы. А маці — з суседняй вёскі Задворнікі, з крыху багацейшай сям'і, з беларусаў. Акрамя беларускай мовы, іншай і не ведала. Цікава, што бацькі маіх бацькоў згоды на іх шлюб не далі, і таму маладыя закаханыя ўцяклі ў Пецярбург і там пабраліся.

Падчас Першай сусветнай вайны бацька, салдат царскай арміі, трапіў у нямецкі палон. Апынуўся ажно ў Баварыі, працаваў чарнарабочым у каталіцкім кляштары. З палону ўцёк, дадому вяртаўся пехатой — ноччу ішоў, а днём хаваўся. Пабачыўшы свет, спазнаўшы нямецкі парадак, ён пасля вяртання ўжо крыху інакш глядзеў на гаспадарку — больш рацыяналістычна. Любіў дысцыпліну, культуру. За што ледзь не паплаціўся. Каб выканаць супрацьпажарныя патрабаванні брата-суседа, мусіў накрыць сваю хату бляхаю. А потым яго за гэта хацелі раскулачыць. Уратавала тое, што бацька ледзь не першым уступіў у калгас.

Сям'я наша была невялікая. Дзяцей нараджалася многа, але яны адно за адным паміралі. Засталіся толькі мая старэйшая сястра і я.

— Тым не менш на працягу амаль дзесяці гадоў вы праводзілі актыўную і плённую работу з беларускімі дыяспарамі замежжа, дзейсна, мэтанакіравана займаліся пытаннямі рэстытуцыі нацыянальнай спадчыны, якая апынулася за межамі Беларусі. І раптам новая нечаканасць — ваш сыход з пасады дырэктара і ўвогуле закрыццё цэнтра. Але вы і на новых сваіх пасадах не пакінулі займацца пытаннямі дыяспар і рэстытуцыі.

— Займацца то я займаюся, але далёка не ў той меры, у якой хацелася б. З-за фінансавых цяжкасцяў спынілася выданне штомесячнага бюлетэня «Кантакты і дыялогі». Вялікі перапынак зроблены ў выпуску серыйнага зборніка «Вяртанне». Фактычна спыніў сваё існаванне бюлетэнь «Беларусіка — Albaruthenica». А тое, што робіцца, робіцца на грамадскіх пачатках, на голым энтузіязме былых супрацоўнікаў цэнтра.

— Відаць, дзеля ідэі ішла праца над энцыклапедыяй знакамітых беларусаў, якія воляю лёсу апынуліся за мяжою?

— Вы маеце на ўвазе энцыклапедычны даведнік «Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў пазнай асацыяцыі беларусістаў, якая мела сваіх людзей, добраахвотных нашых прапагандыстаў у 23 замежных краінах.

Пасля таго, як усе арганізацыйныя праблемы былі вырашаны, паўстала пытанне: а хто нас будзе фінансаваць? Я даводзіў, што навукова-асветніцкі цэнтр, галоўнай задачай якога з'яўляецца прапаганда беларускай культуры за мяжой, павінен быць пры ўрадзе рэспублікі, як гэта зроблена ў іншых краінах. Гэта надасць установе вагу, значнасць, пашырыць яе магчымасці. Аднак у Савеце Міністраў не пагадзіліся і далучылі нас да Міністэрства адукацыі. Хоць мы былі там не зусім дарэчы. Больш лагічна было б прыпісаць нас да Міністэрства культуры альбо Міністэрства замежных спраў.

межных краінах»? У фактычна новае выданне дададзена яшчэ амаль тысяча персаналій.

— Адам Восіпавіч, як вы ставіцеся да кампрамісаў. Кампраміс і беспрынцыпнасць — гэта розныя паняцці?

— Розныя. Беспрынцыпнасць — гэта нежаданне адстойваць свой пункт гледжання. А кампраміс? Ён дыктуецца рэальным жыццём. Ёсць вельмі добрая французская прымаўка: усе спрэчкі скончаліся б вельмі хутка, калі б памыляўся толькі адзін бок. Без кампрамісаў абысціся немагчыма. Возьмем, напрыклад, кнігу «Нашаму добрасуседству — тысяча гадоў», якую мы рыхтавалі разам з літоўскімі калегамі. Калі б мы не паразумеліся, не пайшлі адно аднаму насустрач, то кніга магла б і не выйсці Таму заўсёды трэба шукаць разумнае, узаемапрымальнае рашэнне.

— Апошнім часам шмат спрэчак вядзецца наконт таго, ці можна ставіць знак роўнасці паміж інтэлігентам і інтэлектуалам. На Захадзе, як вы ведаеце, наогул не існуе паняцця інтэлігент. А ў нашым грамадстве, на ваш погляд, ёсць інтэлігентнасць? І калі ёсць, то што гэта такое?

— Ну, мусіць, перш за ўсё разуменне, што ты на гэтым свеце не адзін, што акрамя цябе ёсць яшчэ іншыя людзі. Інтэлігент і інтэлектуал — паняцці ўсё ж розныя. І яны не абавязкова павінны супадаць. Мой цесць, селянін, а потым калгаснік Кароль Вішнеўскі, быў са шляхты. І паводзіў сябе як сапраўдны інтэлігент, хоць быў амаль непісьменны, умеў толькі распісацца. Дык вось інтэлігентнасць — гэта пастаяннае адчуванне, што побач з табою такія ж, як ты, і ты павінен адносіцца да іх гэтак жа, як бы ты хацеў, каб яны адносіліся да цябе. А гэта, паверце, вельмі няпроста.

— Вы па натуры хто — песімі ст ці аптыміст, вясёлы ці хмуры, добры ці жорсткі?

— Гэта залежыць ад абставін. Жыццё ідзе, як гаварыў калісьці Караткевіч, палосамі. Выпадае то чорная паласа — і тады ўсё здаецца кепскім, нямілым, то светлая — і тады навакольны свет успрымаецца таксама светла, радасна. Пры ўсім пры тым я ўсё ж больш аптыміст, чым песімі ст, і хутчэй за ўсё вясёлы, чым хмуры. А калі часам бываю змрочны, то гэта рэакцыя на хамства. Я арганічна, як і калісьці мой бацька, не пераношу мат. Ну і ліслівасць таксама.

— Ці можаце вы сфармуляваць, што такое шчасце?

— Шчасце?.. Гэта, відаць, задавальненне ад таго, што робіш. Хаця, вядома, поўнага шчасця не бывае. Гэта працэс. Але адчуваць, што ты да гэтага стану ўсё бліжэй і бліжэй — гэта вельмі добра.

— Вы верыце ў каханне з першага погляду?

— Веру.

— А ў вечнае каханне?

— Вечнае каханне... Калі гэта разумець як секс, то ён вечным не можа быць. Калі маецца на ўвазе пачуццё, то каханне павінна перарасці ва ўзаемную павагу, глыбокае ўзаемаразуменне.

— Вашы адносіны да музыкі — мінулай, сучаснай...

— Да класічнай — захопленыя. У свой час я браў абанементы на канцэрты ў філармоніі. Цяпер, сорамна прызнацца, рэдка там бываю. Тое ж самае з кіно, тэатрам. Няма часу. У пастаянным цэйтноце.

— Ці любіце вы песні? Самі спяваеце?

— Не, сам не спяваю. Хаця быў у маім жыцці адзін кур'ёзны выпадак. Калі я вучыўся ў школе, у суседнім калгасе імя Сталіна стварылі хор. І вось дзеля масавасці туды ўключылі і мяне. Пасля кіраваць хорам прыслалі са Смаргоні прафесіянала, заслужанага дзеяча культуры Аляксандра Дзярругу. Ён стаў правяраць, хто на што здатны. Паслухаўшы мяне, ён дужа здзівіўся: «Хто вас, мой даражэнькі, ключыў?»

З таго часу я больш не рызыкую спяваць. Але дужа люблю слухаць, як спяваюць іншыя. Асабліва калі спяваюць народныя песні. Як жа хораша ўмеў іх выконваць Валодзя Караткевіч! І голас у яго быў прыгожы.

— Ваш любімы занятак, акрамя літаратуры...

— Калісьці я калекцыянаваў паштоўкі, маркі, звязаныя з літаратурай. Працягваю рабіць гэта трохі і цяпер, але ўжо без асабліва імпэту і сістэмы. Маркі давялося прадаць — адзін час востра патрэбны былі грошы на лячэнне жонкі. А паштоўкі перадаў вядомаму калекцыянеру Ліхадзедаву — там яны не прападуць. Калісьці захапляўся фатаграфіяй. Любіў вудзіць рыбу, лавіў стронгу ў нашай Лошы. Люблю збіраць грыбы.

— У вас многа сяброў?

— На жаль, кола сяброў звужаецца. Сяброўства — штука няпростая. Яно, хутчэй, бывае сярод роўных, аднадумцаў. Але гэта не значыць, што мой сябра павінен думаць гэтак, як я. Важна, каб ён разумеў, пра што я гавару, а я разумеў, пра што гаворыць ён.

— І на заканчэнне — вечнае, біблейскае пытанне: у чым, на вашу думку, сэнс жыцця?

— Сэнс у тым, каб пражыць яго годна, у адпаведнасці з народнай, хрысціянскай мараллю. Разам з тым чалавеку трэба даваць права і на памылку. Чаму? Таму што ўсяго прадбачыць немагчыма. Хаця, калі б у мяне цяпер запыталіся, ці выбраў бы я нейкі іншы жыццёвы шлях, то я адказаў бы: увогуле пайшоў бы тым жа шляхам. Толькі ўжо больш, чым у маладосці, цаніў бы час. Бо жыццё — найкаштоўнейшы Боскі дар, і марнаваць яго на пустое — недаравальная, злачынная раскоша.

Гутарку вёў Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.

■ А вы ведалі?

ЗЛАМАЎ НАГУ — ПЛАЦІ ПАДАТАК НА ГІПС!

Самыя недарэчныя падаткі ў свеце

Бенджамін Франклін казаў: «У гэтым свеце непазбежныя толькі смерць і падаткі...» Гісторыя навучыла нас, што падаткамі можна абкласці практычна ўсё, што заўгодна, хоць гэта не заўсёды прыносіць станоўчыя вынікі. Практычна ў кожнай краіне можна знайсці падаткі, якія могуць выклікаць і здзіўленне, і абурэнне, і рогат, а то і ўсё разам. Паглядзім?

БЕЛЬГІЯ: БАРАЦЬБА З ПАЦЯПЛЕННЕМ

У 2007 годзе мясцовыя ўлады Валоніі, у якой пражывае каля 3,5 мільёна чалавек, вырашылі абкласці падаткам прыгатаванне страў на грылі для барацьбы з... глабальным пацяпленнем. Лічыцца, што падчас прыгатавання ежы такім спосабам у атмасферу трапляе ад 50 да 100 грамаў парніковых газаў. Таму кожны жыхар гэтага рэгіёна Бельгіі, перш чым распаліць у двары барбекю, павінен цяпер ўнесці плату ў памеры 20 еўра. Вы, напэўна, адразу ж падумалі: «Ну, і як яны праверацъ, раблю я грыль ці не?» Аднак улады Валоніі ставяцца вельмі сур'ёзна да праверкі выканання гэтага закона, а дапамагаюць ім у гэтым верталёты з цеплавізійнымі камерамі.

ЗША: КЛОПАТ ПРА ЗДАРОЎЕ

Урад ЗША вырашыў у чарговы раз паклапаціцца пра здароўе сваіх грамадзян. Адным з элементаў рэформы аховы здароўя, якая праводзіцца з 2007 года, стала ўвядзенне падатку на загар у салярыі. Сёння кожны амерыканец, які хоча змяніць колер сваёй скуры, вымушаны плаціць дадатковую плату ў памеры 10 працэнтаў ад кошту паслугі.

ЭСТОНІЯ: АБАРОНА ПАВЕТРА

Гэта, безумоўна, адзін з самых абсурдных падаткаў, пра які вы калі-небудзь пачуеце. У 2008 годзе ўрад Эстоніі прыняў рашэнне аб увядзенні новага падатку для заводчыкаў кароў. На думку чыноўнікаў, гэтыя жывёлы сваімі газамі моцна забруджваюць паветра. Цікава, але дадзены падатак не крануў заводчыкаў іншых жывёл, якія таксама ўносяць свой «немалы ўклад» у выглядзе выкідаў газаў, што маюць парніковы эфект.

ПАР: ВУЧЫЦЦА І ВУЧЫЦЦА

Такім падаткам у ПАР абклалі ўсіх прадпрымальнікаў, у якіх ёсць наёмныя работнікі. Стаўка падатку — 1 працэнт ад заробку ўсіх супрацоўнікаў. Яго мэта — палепшыць развіццё прафесійных навыкаў работнікаў, асабліва сярод чорнага насельніцтва.

ГРЭЦЫЯ: БАРАЦЬБА З РАСКОШАЙ

У Грэцыі басейн у двары прыватнага дома лічыцца раскошай. Таму кожны ўладальнік дома з басейнам абавязаны заплаціць падатак у памеры каля 800 еўра ў год. Многія жыхары Афінаў, якія не хочуць плаціць гэты падатак, хаваюць свае басейны пад брызентам колеру травы.

АЎСТРЫЯ: КАТАЙЦЕСЯ БЕЗ ТРАЎМ

Аўстрыйскія Альпы — гэта ідэальнае месца для тых, хто любіць кататься на лыжах і снаўбордзе. Але праз гэта ж у краіне штогод каля 150 тысяч аматараў лыж трапляюць у аўстрыйскія бальніцы з пераломамі і іншымі траўмамі. З гэтай прычыны ўлады вырашылі ўвесці для турыстаў так званы падатак на гіпс, які збіраюць уладальнікі гатэляў і пансіянатаў.

БАЛЕАРСКІЯ АСТРАВЫ: СОНЦА ЗАРАЗ ДАРАГОЕ

Падатак на сонца абавязаны плаціць усе турысты, якія прыязджаюць на Маёрку, Менорку і іншыя Балеарскія астравы. Плата невысокая, усяго 1 еўра штодзень. Сабраныя грошы мясцовыя ўлады выдаткоўваюць на паляпшэнне турыстычнай інфраструктуры. Дарэчы, у 2012 годзе Балеары наведала больш за 10 мільёнаў турыстаў, так што паступленні ад гэтага падатку — гэта нядрэнная крыніца даходаў мясцовага бюджэту.

КІТАЙ: ПАЛАЧКІ ГУБЯЦЬ ДРЭВЫ

Штогод у Кітаі выкарыстоўваецца для ежы каля 45 мільярдаў аднаразовых палачак, для вытворчасці якіх высякаецца 25 мільёнаў дрэў. З гэтай прычыны ўлады вырашылі ўвесці спецыяльны 5-працэнтны падатак пры куплі аднаразовых бамбукавых палачак для ежы. Гэта зроблена для таго, каб насельніцтва больш ахвотна выкарыстоўвала шматразовыя палачкі, зробленыя з пластыка. Але традыцыі для кітайцаў важнейшыя, чым эканамічная мэтазгоднасць.

ВЕНЕЦЫЯ: ПРЫБЯРЫЦЕ ЦЕНЬ

У 1993 годзе ўлады Венецыі вырашылі абкласці падаткам уладальнікаў рэстаранаў і невялікіх крам, нерухомасць якіх кідае цень на тэрыторыю, што належыць гораду. Пасля ўвядзення «ценявога падатку» шматлікім уладальнікам месцаў гандлю і харчавання давялося дэманціраваць розныя прыстасаванні (навесы, маркізы) са сцен сваіх будынкаў.

ВЕНГРЫЯ: ХАРЧУЙЦЕСЯ ПРАВІЛЬНА

«Чыпсавы падатак» уступіў у сілу ў Венгрыі з 1 верасня 2011 года. Ім абкладаецца розная расфасаваная ежа, такая як чыпсы, салёнае печыва, салодкае печыва, пірожныя ва ўпакоўцы, а таксама энергетычныя напоі. Такім чынам урад Венгрыі хоча зрабіць харчаванне венгерскіх грамадзян больш здаровым

СЁННЯ

Месяц

Поўня 29 жніўня.
Месяц у сузор'і Рака.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.08	20.13	14.05
Віцебск —	5.55	20.05	14.10
Магілёў —	5.58	20.03	14.05
Гомель —	5.58	19.57	13.59
Гродна —	6.24	20.27	14.03
Брэст —	6.28	20.25	13.57

Імяніны

Пр. *Аляксея, Аркадзя, Васіля, Мікалая, Уладзіміра, Фёдара.*
К. *Монікі, Цэзара, Юзафа.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

27 ЖНІЎНЯ

1919 год — савецкі ўрад прыняў дэкрэт аб нацыяналізацыі ўсёй кінасправы ў краіне. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі расійскія кінапрадпрыемствы яшчэ каля двух гадоў працягвалі знаходзіцца ў прыватных руках. Большасць іх уладальнікаў адмоўна ставіліся да бальшавікоў. У першыя дні савецкай улады яны адмаўляліся выдаваць камеры і плёнку кінааператарам, якія жадалі захаваць для гісторыі рэвалюцыйныя падзеі. У адным толькі 1918 годзе прыватныя кінафірмы паставілі каля 150 фільмаў. Асноўную іх масу складалі містычныя стужкі, любоўныя меладрамы, гістарычныя і іншыя карціны. Падчас грамадзянскай вайны, па меры нарастання голаду і разрухі, мноства рускіх кінематаграфістаў пакінулі Маскву і Петраград і пераехалі на поўдзень — ў Адэсу і Крым, адкуль нярэдка эмігрыравалі на захад, везучы з сабой фільмы і здымачную апаратуру. У той жа час Ленін адзначаў, што кіно з'яўляецца найважнейшым мастацтвам, магутным прапагандысцкім інструментам, а іншыя кіраўнікі савецкай дзяржавы заклікалі «ўзяць кінематограф у свае рукі». Кінематаграфісты, якія падтрымлівалі савецкую ўладу, здымалі ў гэты час у асноўным хранікальныя фільмы пра рэвалюцыю і грамадзянскую вайну або мастацкія кінаагіткі. 27 жніўня 1919 года быў выдадзены Дэкрэт Савета Народных Камісараў аб нацыяналізацыі кінасправы. З гэтага часу ўся фота- і кінематаграфічная прамысловасць і адпаведны гандаль перайшлі ў падпарадкаванне Народнага камісарыята асветы, які ўзначальваўся Анатолем Луначарскім. У памяць аб гэтай падзеі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 25 красавіка 1979 г. было ўстаноўлена, што 27 жніўня з'яўляецца Днём савецкага кіно.

1860 год — 155 гадоў таму нарадзіўся (вёска Станькава Дзяржынскага раёна) Карл Эмерыкавіч Чапскі, адзін з прадстаўнікоў старажытнага роду Гутэн-Чапскіх.

У 1882 годзе скончыў Дзерпцкі (Тартускі) універсітэт. У 1890-1901 гадах — гарадскі галава ў Мінску. Узначальваў многія грамадскія і дзяржаўныя арганізацыі. Адкрыў у Мінску прытулак, шпіталь, амбулаторыю, пусціў электрастанцыю, трамвай, забрукаваў вуліцы. Садзейнічаў адкрыццю ў горадзе Таварыства аматараў спорту (з 1892-га — яго старшыня), Таварыства аховы жанчын, гарадское крэдытнае таварыства. Быў актыўным членам Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Пабудаваў піўзавод «Багемія», прададзены пасля сямейству Лекертаў. Памёр у 1904 годзе.

1945 год — 70 гадоў таму нарадзіўся (вёска Звяняцкае Хойніцкага раёна) Генадзь Мікалаевіч Здор, беларускі вучоны ў галіне апрацоўкі матэрыялаў і тэхналогіі машынабудавання, доктар тэхнічных навук (1999), прафесар. У 1967 годзе скончыў БДУ. Аўтар навуковых прац па асновах праектавання тэхналагічных працэсаў формаўтварэння тонкаліставых матэрыялаў імпульснымі нагрузкамі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1980).

Было сказана

Сяргей ГРАХОЎСКІ, паэт:

У кожнага — адзіная дарога
Ад метрыкі да некралога,
А паміж імі, як заўжды, —
Хвіліны радасці і горычы гады...

УСМІХНЕМСЯ

Распрацаваны самы грозны папераджальны дарожны знак: «Увага! Інспектар ўзяў іпатэку!»

— Красуня, дай нумар тэлефона!

— Малады чалавек, пішыце — 0695671230.

— Ого, так адразу...

— Пішыце, пішыце, не саромейцеся. Патэлефануеце сёння ўвечары роўна ў шэсць. У сем сустракаемся на вячэры, я пазней есці не люблю. Сёння сексу не будзе — рана. Вазьміце грошы — я люблю крабаў. Квета не трэба, сэканоміце. Заўтра можна секс. Я люблю зверху. Паўгода вам дастаткова? Мне нельга цягнуць з дзецьмі, ды і вам таксама. Хлопчык, потым дзяўчынка. Я растаўсцею, вы палысееце. Вы пойдзеце да суседкі, а я адбяру вашу кватэру.

— Вось дурная.

— Лепш выдаткаваць дзве хвіліны, чым дваццаць гадоў.

Хочаш выхаваць сілу волі? Паспрабуй з'есці толькі адну семачку.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3310. Нумар падпісаны ў 19.30 26 жніўня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12